Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
21 СТУДЗЕНЯ 2017 г. СУБОТА № 14 (28378)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Экстрэмальная медыцына ў баявых умовах**
СТАР. 4



**Эратызм, пазалота і скандальнасць карцін Клімта**
СТАР. 8



**ЖЫЦЬ, не выходзячы з дому**
СТАР. 11

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Міністэрству жыллёва-камунальнай гаспадаркі даручана навесці парадак у разліках за жыллёва-камунальныя паслугі. У Адміністрацыю Прэзідэнта паступаюць звароты грамадзян з просьбамі разабрацца ў правільнасці налічэння аплаты за жыллёва-камунальныя паслугі. Уважліва паглядзіце і дайце ўказанне службам, каб звярнулі ўвагу на тое, якія паведамленні адпраўляюць людзям. Гэта неабходна ўзяць пад жорсткі кантроль, пад персанальную адказнасць кіраўнікоў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9423 | ▼ |
| Еўра | 2,0754 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0708 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Да новых сустрэч, Каляда!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёлета спаўняецца 20 гадоў, як у Бярэзінскім раёне аднавілася прыгожая традыцыя праводзін калядных свят пад назвай «Цягнуць Каляду на дуба». Ля вытокаў адраджэння стаяла былы дырэктар Дома культуры вёскі Новіны Ніна Клімовіч *(на здымку ў цэнтры)*. За гэты час абрад стаў часткай гісторыка-культурнай спадчыны Міншчыны, яму афіцыйна прысвоены ахоўны статус. І цяпер 21 студзеня ў вёсцы ладзяцца гэтыя незвычайныя праводзіны. А дапамагаюць Ніне Дзмітрыеўне яе сын, нявестка, унучка, іншыя шматлікія сваякі і многія руплівыя аднавяскоўцы.

■ Прыгожае жыццё

## ЗНОЎ ЗАЦВІТУЦЬ КАШТАНЫ?

### Экзатычныя кветкі сёлета і любімыя каштаны праз дзясятак гадоў з'явяцца на вуліцах Гомеля

**Снег і мінусавая тэмпература паветра — не перашкоды, каб абмеркаваць планы азелянення наступнай вясной. Бо, вядома, яна прыйдзе неўзабаве. Нейкіх паўтара-два месяцы і ўсё навокал пачне квітнець. Тым часам да 1 красавіка трэба паспець правесці абразанне і фармоўку крон больш дзесяці тысяч дрэў у абласным цэнтры. На круглым стале, сабраным у Гомельскім гарвыканкаме, расказалі і пра іншыя мерапрыемствы, якія павінны зацвердзіць за горадам над Сожам статус лепшага з абласных у Беларусі па санітарным стане і добраўпарадкаванні. Нагадаем, што за апошнія пяць гадоў у гэтым спаборніцтве Гомель перамагаў тройчы.**

### Душ для гарадскіх дрэў

**Першы намеснік генеральнага дырэктара Гомельскай гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рыгор ТУРАВЕЦ** адзначае, што ў абласным цэнтры распрацавана праграма азелянення з улікам рэкамендацый Інстытута лесу, наладжана сістэма догляду за зялёнымі насаджэннямі, арганізаваны кантроль за выкананнем вызначаных мерапрыемстваў. Кожнае дрэва мае свой інвентарны нумар і абслугоўваецца спецыялістамі.

Экалагічная нагрузка, якая на цэнтральных вуліцах вышэйшая ў разы, чым на перыферыі, патрабуе і асаблівага стаўлення да пасадак. Таму час ад часу дрэвам мяняюць грунт у лунцы, мыюць ствалы і падкормліваюць збалансаванымі ўгнаеннямі. Між тым штогод у абласным цэнтры закладаюцца новыя алеі, зялёныя зоны, з'яўляюцца арыгінальныя кветнікі. Толькі летась у паўмільённым Гомелі было высаджана 6350 дрэў і больш за 4500 хмызнякоў. Не менш будзе і сёлета.

СТАР. 3

■ Абмяркуем

## ЦІ МАГЧЫМАЯ ШКОЛА БЕЗ ВЫХАВАННЯ?

### Чаму маральныя ісціны нельга падаваць дзецям на спадачку



Майстар-клас Галіны СУХАВАЙ, прысвечаны выхаваўчаму аспекту ўрокаў беларускай літаратуры.

**Па самых прыблізных падліках, за час сваёй вучобы ў школе дзіця наведвае больш як 10 тысяч самых розных урокаў. Але як настаўнікі распараджаюцца гэтым бясцэнным патэнцыялам? Выхаваўчыя магчымасці вучэбных прадметаў і іх рэалізацыя на школьных занятках аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў VI Рэспубліканскага каляднага фестывалю педагагічнага майстэрства, які ператварыўся ў сапраўдны феерверк педагагічных ідэй, нестандартных падыходаў і дазволіў па-новаму паглядзець на многія рэчы.**

СТАР. 7

# РУБЯЖЫ АЙЧЫНЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнне на ахову Дзяржаўнай граніцы Беларусі органамі пагранічнай службы ў 2017 годзе**

Як паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, Прэзідэнт адзначыў, што летась тэма аховы граніцы двойчы абмяркоўвалася на яго ўзроўні. «Была праведзена праверка практычнай дзейнасці органаў пагранічнай службы, якую вы, напэўна, успрынялі не зусім адназначна. Усе ваенныя ведамствы, перш за ўсё пагранічныя войскі, будуць у фокусе ўвагі Прэзідэнта. Да гэтага трэба прывыкаць. Такая ўвага гэтым пытанням удзяляецца не дарма», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, няпростая міжнародная абстаноўка, узрастанне тэрарыстычнай небяспекі ў свеце, незаконная міграцыя, распаўсюджванне наркотыкаў, зброі прымушаюць беспярапынна павышаць узровень абароны рубяжоў краіны. «Пакуль не даводзіцца разлічваць, што ў хуткім часе пагроз нашай пагранічнай бяспецы стане менш», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што практычна ў штодзённым рэжыме вырашаецца шмат пытанняў, якія датычацца граніцы і непасрэдна дзейнасці пагранічнага ведамства. Дзяржавай пастаянна выдзяляюцца неабходныя сродкі на паляпшэнне ўзроўню матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці пагранічнікаў. «Вядома, ні адно ведамства яшчэ не сказала, што сродкаў дастаткова. Але трэба шукаць іншыя формы. Уладкаванне, перш за ўсё, і абароны Дзяржаўнай граніцы», — сказаў ён.

На граніцы ўводзяцца ў строй новыя комплексы кантролю і назірання, вядзецца супрацоўніцтва па адпаведнай тэматыцы з Еўрапейскім саюзам. «Вядома, гэта супрацоўніцтва павінна быць больш аб'ёмным. Таму што мы нясём вялікую нагрузку па абароне Еўрапейскага саюза па асобных напрамках, такіх, як незаконная міграцыя, наркагандаль, гандаль людзьмі. Гэта нам абыходзіцца ў добрыя грошы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што свой уклад у справу аховы Дзяржаўнай граніцы традыцыйна ўносяць не толькі пагранічнікі, але і звычайныя грамадзяне, якія пражываюць у прыгранічнай зоне.

Кіраўнік дзяржавы таксама закрануў пытанні аптымізацыі ў органах пагранічнай службы, канстатаваўшы, што іх колькасць і цяпер параўнальна невялікая. «Але тым не менш трэба пaглядзець па пераразмеркаванні асабовага складу. Трэба менш людзей у інстытутах, цэнтральных і іншых апаратах, а больш непасрэдна на граніцы», — заявіў ён.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся тым, што робіцца для аблягчэння перасячэння граніцы грамадзянамі ў пунктах пропуску, якімі мерамі ў далейшым плануецца забяспечваць парадак у пагранічнай зоне і на прыгранічнай тэрыторыі. У ліку абазначаных пытанняў таксама было павышэнне ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі ваеннаслужачых і стварэнне аптымальных умоў для жыцця і службы асабовага складу.

* * *

**Станіслаў ЗАСЬ, сакратар Савета бяспекі:**

### «ПАМЕЖНЫМ ВЕДАМСТВАМ ПРАВЕДЗЕНА ВЯЛІКАЯ РАБОТА ПА ЎМАЦАВАННІ БЯСПЕКІ НА ЗНЕШНІХ РУБЯЖАХ»

Станіслаў Зась адзначыў, што ў цэлым сістэмных праблем або правалаў у дзейнасці Дзяржаўнага пагранічнага камітэта ў мінулым годзе не дапушчана. Паводле яго слоў, у рашэнні на ахову дзяржграніцы вызначаны задачы, якія цалкам улічваюць асаблівасці абстаноўкі, што складваецца на знешніх рубяжах краіны.

Адной з такіх асаблівасцяў дзяржсакратар Савета бяспекі назваў рашэнне аб увядзенні бязвізавага рэжыму для грамадзян 80 дзяржаў, якія прыбываюць у краіну на тэрмін да 5 сутак праз Нацыянальны аэрапорт Мінск. «Гэта ніяк не ўплывае на бяспеку і нашай дзяржавы, і нашых суседзяў. Таму што практычна нічога ў плане кантролю за прыбыццём не мяняецца. Як і раней, любы грамадзянін будзе праходзіць пашпартны кантроль. Пры гэтым адсейваюцца асобы, знаходжанне якіх у нашай краіне непажадана з тых ці іншых прычын», — заявіў ён.

«Другой адносна новай асаблівасцю, якая сфарміравалася вакол нашых знешніх межаў, з'яўляецца тое, што на ўсходняй граніцы расійскі бок у аднабаковым парадку ўвёў абмежаваны пашпартны кантроль у адносінах да замежных грамадзян у пунктах перасячэння граніцы паміж Беларуссю і Расіяй. Гэта ніяк не ўплывае на транзіт нашых грузаў і пасажыраў у цэлым, але дастаўляе некаторыя нязручнасці замежным грамадзянам, якім цяпер вымушаны шукаць больш доўгі аб'язны шлях», — адзначыў дзяржсакратар Савета бяспекі.

«Але гэта справа Расійскай Федэрацыі. Калі яны лічаць, што гэта павышае абароненасць іх краіны, — гэта іх права. Хоць асаблівага сэнсу ў гэтым я не бачу», — дадаў Станіслаў Зась.

Сітуацыю на беларуска-расійскай граніцы ў пачатку студзеня каментавалі і ў беларускім знешнепалітычным ведамстве. У прыватнасці, Беларусь прапануе Расіі на час перамоваў па пропуску грамадзян трэціх краін праз сумесную мяжу прытрымлівацца ранейшай практыкі, якая апраўдала сябе.

# Катастрофы няма

**Скарачэнне паставак расійскай нафты ў Беларусь павінна быць замешчана альтэрнатыўнымі варыянтамі**

**Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашку, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы дамаўляліся, што ў найбліжэйшы час вы мне дaложыце аб сітуацыі ў нафтагазавым комплексе краіны, асабліва ў сувязі з паводзінамі Расіі. Па нашых дамоўленасцях і пагадненнях, раней заключаных, якая ў нас абстаноўка? Мы нічога не ўтойваем ад людзей. Утойваць, я думаю, не трэба. Катастрофы няма, але скарачэнне паставак нафты ад Расійскай Федэрацыі павінна быць замешчана альтэрнатыўнымі варыянтамі», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што адпаведныя пытанні абмяркоўваліся яшчэ ў канцы мінулага года. «І мы гэтыя альтэрнатыўныя варыянты не проста прапрацоўвалі. Мы некаторыя паспрабавалі, выпрабавалі ўжо на практыцы, дастаўляючы нафту з Чорнага і Міжземнага мораў на нашы нафтаперапрацоўчыя заводы, каб на практыцы паглядзець, як гэта будзе выглядаць эканамічна», — сказаў Прэзідэнт.

■ Парламенцкі дзённік

# РЭГІЁНУ ДАПАМОГУЦЬ ІНВЕСТЫЦЫІ

**Сенатары правялі выязное пасяджэнне ў Лідскім раёне**

**Дабрабыт людзей залежыць ад паспяховасці прыцягнення замежных інвестыцый. Такую думку выказаў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, падчас выязнога пасяджэння ў Лідскім раёне Гродзенскай вобласці Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры верхняй палаце парламента.**


Фота БЕЛТА.

**Удзельнікі пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі наведалі Мінойтаўскі рамонтны завод.**

«Неабходна выконваць пастаўленыя кіраўніком дзяржавы задачы па выхадзе на ўзровень заробатнай платы прыкладна ў тысячу рублёў. Рабіць так, каб дабрабыт людзей рос. Інвестыцыі дазваляюць гэта зрабіць, яны прыводзяць за сабой новыя тэхналогіі, дапамагаюць стварыць вытворчасці і забяспечваюць дастойную заробатную плату», — заявіў спікер.

Дэпутаты мясцовага ўзроўню ў Беларусі — гэта каля 19 тысяч чалавек, якія мусяць уключыцца ў работу па прыцягненні інвестыцый. Іх вопыт павінен быць запатрабаваны ў гэтым рэчышчы, а правядзенне выязных пасяджэнняў Саветаў — гэта своеасаблівая дадатковая школа для дэпутатаў, лічыць старшыня Савета Рэспублікі. Досвед Гродзенскай вобласці ў прыцягненні інвестыцый з'яўляецца станоўчым. Разам з Гомельскай вобласцю гэты рэгіён у мінулым годзе справіўся з даведзенымі заданнямі па прамых замежных інвестыцыях. Міхаіл Мясніковіч бачыць далейшую работу ў гэтым кірунку перспектыўнай.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Занятасць

# ВЁСКА ПРЫМАЕ РАБОТНІКАЎ

**Летась 151 сям'я беспрацоўных пераехала на новае месца жыхарства і працы**

Гэтай мерай дзяржаўнай падтрымкі часцей карысталіся сем'і з непаўналетнімі дзецьмі. У саставе сем'яў пераважалі людзі працаздольнага ўзросту. Перасяляліся збольшага ў сельскую мясцовасць, у асноўным у межах адной вобласці.

На пераезд служба занятасці выплачвае суму ў памеры 7 бюджэтаў пражытачнага мінімуму (на сёння гэта каля 1,2 тысячы рублёў). Пры перасяленні сям'і, у складзе якой некалькі беспрацоўных, 7 бюджэтаў даюць кожнаму пры ўмове заключэння з імі дагавора і атрымання гарантаванага месца работы. Тым, хто пераязджае з горада ў малыя або сярэдняя гарадскія паселішчы, у сельскую мясцовасць, у гарады-спадарожнікі, дадаткова выплачваюць яшчэ два бюджэты пражытачнага мінімуму.

Гэтая мера стымулюе працоўную мабільнасць грамадзян, спрыяе пераразмеркаванню работнікаў з улікам патрэбнасцяў рэгіёнаў у кадрах. Дзяржаўнай праграмай аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва на 2016—2020 гады прадугледжана, што дапамогу ў перасяленні акажуць больш як 700 сем'ям.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# «ХАЧУ НАДЗЕЛ ЗЯМЛІ, АЛЕ... ПАД МІНСКАМ»

## Цяпер участак для будаўніцтва можна атрымаць толькі з аўкцыёна



**Як паказвае практыка, у большасці жыхароў прысталічных раёнаў узнікае шмат пытанняў па зямельных адносінах. Такіх праблем, як правіла, няма на аддаленых ад Мінска тэрыторыях, у тым жа Крупскім, Старадарожскім раёнах. А тут, зразумела, кожны імкнецца займець надзел або пашырыць яго — зямля пад Мінскам нятанная. І з кожным годам будзе даражэць. Нехта хоча пабудаваць вытворчасць — добрая лагістыка, забяспечанасць кадрамі. Хтосьці гадамі змагаецца са спадчыннікамі, каб стаць адзіным уладальнікам старога бацькоўскага дома, які не ўяўляе сабой матэрыяльнай каштоўнасці, ды месціцца на ладным зямельным надзеле. А то патрабаванні выстаўляць члены садоўніцкіх таварыстваў, якія, па сутнасці, з'яўляюцца дзяржавай у дзяржаве, са сваім кіраўніцтвам, і павінны вырашаць узаемныя спрэчкі, прэтэнзіі, праблемы на агульным сходзе.**

На прыёме грамадзян Мінскага раёна кіраўніку цэнтральнага рэгіёна Сямёну Шапіру таксама давялося выслухаць шмат заяўнікаў з аналагічнымі пытаннямі. Дырэктар аднаго з прыватных прадпрыемстваў, якое займаецца вытворчасцю будаўнічых металічных вырабаў і канструкцый, прасіў пасадзейнічаць у заканчэнні працэдуры афармлення дакументаў на зямельны ўчастак у вёсцы Лужкі Смалявіцкага раёна. У 2012 годзе райвыканкам узгадніў акт выбару ўчастка ў 70 сотак для ўзвядзення вытворчых памяшканняў. Надзел знаходзіўся ў межах населенага пункта, таму ўзгадненне Мінаблвыканкама не патрабавалася. Калі быў падрыхтаваны праект, высветлілася: участак не можа быць адведзены. Справа ў тым, што, пры пераносе дакументацыі з папяровых планшэтаў на электронныя носьбіты, 35 сотак зямлі «выйшлі» за межы вёскі, трапілі, так бы мовіць, пад юрысдыкцыю Мінаблвыканкама. Дырэктару прапанавалі правесці працэдуру ўзгаднення яшчэ раз. Ён так і зрабіў. Але афіцыйных дакументаў, якія ўстанаўлівалі б права валодання ўчасткам, ён так і не атрымаў. А ў 2014-м надзел увайшоў у аўкцыённую зону, і ў адпаведнасці з заканадаўствам чалавек не змог завяршыць працэдуру адводу.

У аналагічнай сітуацыі аказалася і яшчэ адно прыватнае прадпрыемства. Яно прайшло ўсе працэдуры ўзгаднення па выбары і адводзе ўчастка для будаўніцтва аб'екта прыдарожнага сэрвісу на 26-м кіламетры трасы Мінск—Віцебск у Смалявіцкім раёне. Распрацавалі адпаведны праект, але занадта складаной аказалася канструкцыя будынка. Зразумелі, што не ўкладваюцца ў вызначаныя для будаўніцтва тэрміны і звярнуліся ў райвыканкам з просьбай падоўжыць іх на год. Цяпер участак, як і папярэдні, увайшоў у аўкцыённую зону. Які выхад? Купіць зямлю на аўкцыёне? Але кіраўнік сцвярджае, што ў падрыхтоўчыя работы ўкладзена шмат сродкаў. Ды і дзе гарантыя, што, у прынцыпе, ужо расчышчаную пляцоўку не перахопяць іншыя фірмы. «Да ўсіх павінны быць аднолькавыя адносіны. Усім, хто хоча атрымаць участак, неабходна прайсці праз аўкцыён. У канцы 2013 года кіраўнік дзяржавы даў даручэнне па стварэнні аўкцыённых зон для продажу зямлі. Гэта зроблена для таго, каб выключыць карупцыйны складнік. Да таго часу было выдана шмат актаў выбару зямельных участкаў», — канстатаваў Сямён Шапіра.

Тут ёсць два варыянты рашэння праблемы — выкупіць зямлю па кадастравай кошце або звярнуцца ў суд. Губернатар прапанаваў заяўніку таксама паўдзельнічаць у аўкцыёне па продажы недабудаванай гасцініцы на тым жа Смалявіцкім напрамку. Але мужчына адмовіўся.

**Усім, хто хоча атрымаць участак, неабходна прайсці праз аўкцыён. Гэта зроблена для таго, каб выключыць карупцыйны складнік.**

Жыхары аграгарадка Чурылавічы расказалі, што ў 2011 годзе ім быў прадастаўлены зямельны ўчастак у арэнду на 50 гадоў для будаўніцтва аб'екта на 19-м кіламетры дарогі Р3 Мінск—Мікашэвічы ў раёне вёскі Самахвалавічы. 31 мая 2016-га Мінскі райвыканкам прыняў рашэнне аб спыненні права пастаяннага карыстання ім. І цяпер гаспадары павінны яго вызваліць. Мясцовыя ўлады матывуюць сваё рашэнне тым, што арандатар парушыў умовы пагаднення: да 2016 года аб'ект не быў пабудаваны. Праўда, на гэтым надзеле з'явілася некалькі пабудоў: невялікая будка для вартаўніка, які ахоўвае аўтамабільную стаянку, будынак для рамонту тэхнікі. Але аб'ект прыдарожнага сэрвісу прадугледжвае іншае. Як правіла, гэта комплексы, дзе кіроўцы, пасажыры могуць адпачыць, падсілкавацца, пераначаваць. Таму кіраўнік сталічнай вобласці падтрымаў рашэнне райвыканкама. Пры гэтым ён заўважыў, што ў Мінскай вобласці ёсць прыклады адабрання аб'ектаў у інвестараў, якія не выканалі ўзятыя на сябе абавязацельствы. «Мэтавае прызначэнне аб'ектаў вызначаецца на першапачатковым этапе інвестдагавора, і за гэта нясуць адказнасць як інвестар, так і аблвыканкам», — падкрэсліў Сямён Шапіра.

Кіраўнік адной з фермерскіх гаспадарак хадайнічала аб выдзяленні дадатковага зямельнага ўчастка. У 2005 годзе ёй было выдзелена 3,5 гектара зямлі. Побач знаходзілася звалка, яе прыбралі, месца ўпарадкавалі і аграрадзілі. Цяпер тут утульна, камфортна, устаноўлены альтанкі. Гаспадыня прасіла пасадзейнічаць ёй у тым, каб далучыць гэтыя 23 соткі да агульнага надзелу і ўзаконіць пабудовы. Але ёй было адмоўлена ў гэтым, паколькі прыхопленыя «лішкі» знаходзяцца ў лесапаркавай зоне. Па законе яны могуць выдзяляцца толькі па рашэнні Прэзідэнта. Што датычыцца пабудоў, то ўзведзеныя без адпаведнага дазволу ўладаў павінны быць знесены. Ім не можа быць нададзены юрыдычны статус. Адпаведнае рашэнне Мінаблвыканкама дзейнічае даволі працяглы час.

Разам з тым Сямён Шапіра нагадаў, што на Міншчыне выяўлена і ўзята на ўлік 15 тыс. гектараў нявыкарыстаных зямель, якія прапануюць фермерам. І заяўніцы могуць прадаставіць хоць 50—100 гектараў у любым раёне вобласці. Але жанчына хоча менавіта ў Мінскім раёне, і пажадана побач са сваім участкам. Такой магчымасці ў густазаселеным прысталічным раёне няма.

Акрамя зямельных адносін і спрэчак, да Сямёна Шапіры звярталіся і па іншых пытаннях.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ БелАЭС

# БЯСПЕКІ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

Калі так казаць пра атамную энергетыку, то гэта не проста словы. **Кіраўнік дэпартамента па ядзернай бяспецы Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) Гжэгаш РЖЭНТКОЎСКІ** паведаміў, што Беларусь даволі актыўна і пасляхова супрацоўнічае з іх арганізацыяй.

Таксама ён адзначыў, што «беларускі ўрад у поўнай меры ўсведамляе сваю адказнасць у гарантаванні ядзернай бяспекі. Краіна гэта дэманструе вельмі выразна, бо запрашаецца вялікая колькасць місій у Беларусь і прымаецца ўдзел у Канвенцыі па ядзернай бяспецы. Кіраўнік дэпартамента па ядзернай бяспецы МАГАТЭ нагадаў, што наша краіна пачала супрацоўніцтва з агенцтвам досыць даўно. «Беларусь робіць пэўныя крокі, каб уцягнуць МАГАТЭ ў ацэнку сваёй ядзернай праграмы. Пачатак гэтаму быў пакладзены яшчэ падчас місіі, якая разглядала фундаментальныя пытанні пачатку развіцця ядзернай праграмы ў Беларусі», — дадаў ён.

Таксама Гжэгаш Ржэнткоўскі звярнуў увагу на тое, што летась наша краіна прымала місію МАГАТЭ па комплекснай ацэнцы, якая рэгулюе інфраструктуру ядзернай і радыяцыйнай бяспекі (IRRS-місія). Краіна паабяцала прыняць іншыя дадатковыя місіі агенцтва, у тым ліку місію, якая будзе займацца пытаннямі гатоўнасці да аварыйнага рэагавання.

На прэзентацыі вынікаў працы SEED-місіі МАГАТЭ ў Беларусі **намеснік міністра энергетыкі Міхаіл МІХАДЗЮК** паведаміў, што нам вельмі важна гарантаваць бяспеку АЭС у супрацоўніцтве з гэтай структурай. Паводле яго слоў, для Беларусі, якая будуе першую атамную электрастанцыю, вельмі важна гарантаваць ядзерную бяспеку гэтага аб'екта на ўсіх стадыях жыццёвага цыкла, пачынаючы з выбару пляцоўкі для яе будаўніцтва. «Ядзерная бяспека для нас галоўны прыярытэт. Для гэтай мэты мы актыўна задзейнічаем магчымасці міжнароднага супрацоўніцтва і, у першую чаргу, супрацоўніцтва з Міжнародным агенцтвам па атамнай энергіі», — адзначыў Міхаіл Міхадзюк.

Намеснік міністра лічыць, што Беларусь у поўнай меры карыстаецца ўсімі інструментамі, якія МАГАТЭ дае краінам, што падышлі да развіцця ядзернай энергетыкі. «На працягу многіх гадоў мы цесна супрацоўнічаем з агенцтвам па праграмах тэхнічнага супрацоўніцтва, калі рэалізуюцца праекты ў сферы падрыхтоўкі кадраў для ядзернай энергетыкі, па лініі ўмацавання патэнцыялу эксплуатуючай арганізацыі, развіцця культуры ядзернай бяспекі, абыходжання з радыеактыўнымі адходамі і адпрацаваным ядзерным палівам і па многіх іншых напрамках», — растлумачыў ён. Так, напрыклад, на гэтым тыдні паралельна з місіяй SEED у Астраўцы праходзіць семінар МАГАТЭ па пытаннях абыходжання з радыеактыўнымі адходамі і адпрацаваным ядзерным палівам.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Факт

## ПОЛАЦК — НОВАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ СТАЛІЦА

**Маладзёжнай сталіцай Беларусі ў 2017 годзе па выніках рэспубліканскага конкурсу абраны Полацк. Усяго на гэта званне прэтэндавалі 11 гарадоў краіны, а ў фінале спаборнічалі чатыры.**

У Міністэрстве адукацыі агучылі асноўныя крытэрыі, па якіх ацэньваліся прэтэндэнты: гэта колькасць моладзі, інфармацыя аб рэалізацыі маладзёжнай палітыкі за 2016 год, добраўпарадкаванне тэрыторыі горада, наяўнасць сацыяльнай інфраструктуры, магчымасці для баўлення маладымі людзьмі вольнага часу, заняткаў спортам, адпачынку, праекты маладзёжных мерапрыемстваў, запланаваныя на 2017 год. Па ўсіх пунктах выйграў Полацк.

Першыя тэматычныя мерапрыемствы пройдуць у горадзе ў канцы студзеня. На працягу года Полацк стане пляцоўкай для рэспубліканскіх і міжнародных маладзёжных мерапрыемстваў: фестываляў, акцый, праектаў, сустрэч, канферэнцый. У іх возьмуць удзел прадстаўнікі навучэнскай, студэнцкай і працоўнай моладзі як з Беларусі, так і з краін блізкага і далёкага замежжа.

Конкурс «Маладзёжная сталіца Беларусі» праводзіцца другі год запар з мэтай стварэння ўмоў для самарэалізацыі моладзі, выяўлення новых ідэй і ажыццяўлення інавацыйных праграм, звязаных з удзелам моладзі ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці краіны.

Першай маладзёжнай сталіцай быў выбраны горад Баранавічы. За год у ім прайшло больш як 130 мерапрыемстваў раённага, рэспубліканскага і міжнароднага маштабу: міжнародны студэнцкі форум «Я кажу «Так!», рэспубліканскі конкурс «Лідар года», рэспубліканскі адкрыты дыялог «Роля моладзі ў развіцці краіны» і іншыя.

Арганізатарам і ідэйным натхняльнікам конкурсу выступае Міністэрства адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ПАДАРУНАК СЯДЗІБЕ

**Заключныя мерапрыемствы ў рамках абласной дабрачыннай акцыі «Цуды на Каляды» прайшлі ў сядзібе XIX стагоддзя ў Чырвоным Беразе Жлобінскага раёна.**

Валанцёры руху «Добрае Сэрца» БРСМ і піянеры-цімураўцы ў кожным раёне Гомельшчыны ў навагоднія дні дарылі дзецям свята. Больш чым чатыром тысячам дзяцей, дзякуючы ахвяраванням грамадзян і спонсарскіх арганізацый, яны сабралі падарункаў на суму каля Br30 тыс. У Чырвоным Беразе дзеці пабывалі на экскурсіі, пасля чаго ў Палацы культуры Жлобіна для іх прайшло тэатралізаванае навагодняе прадстаўленне. Кожны з 50 выхаванцаў сацыяльна-педагагічных прытулкаў Гомельскай вобласці атрымаў падарункі: спартыўны інвентар, цацкі, канцылярскія тавары...

— Да таго ж на завяршэнне Года культуры піянеры і Саюз моладзі зрабілі важны ўнёсак у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны нашага рэгіёна, — расказаў старшыня Гомельскай абласной піянерскай арганізацыі Арцём Карпенка. — Маладыя людзі сабралі і перадалі на рэстаўрацыю сядзібы ў Чырвоным Беразе Br4,5 тыс.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Спорт без межаў

# Турнір на дваіх

**Мінск і Рыга падалі сумесную заяўку на правядзенне чэмпіянату свету па хакеі-2021.**

Пра гэта паведамілі на спецыяльна скліканай прэс-канферэнцыі ў сталічнай ратушы. Адпаведны дакумент падпісалі кіраўнікі хакейных федэрацый Беларусі і Латвіі. Акрамя гэтага, былі прэзентаваны афіцыйны лагатып магчымага чэмпіянату.

Канчатковае рашэнне аб месцы правядзення спартыўнага форуму Міжнародная федэрацыя хакея агучыць 19 мая падчас кангрэса ў Кёльне. Канкурэнт беларуска-латвійскай прапановы — заяўка Фінляндыі.

— Чэмпіянат свету, што прайшоў у нашай краіне ў 2014 годзе, пакінуў вельмі яскравыя ўражанні ў балельшчыкаў: як грамадзян краіны, так і нашых гасцей, — сказаў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Максім РЫЖАНКОЎ.** — Аналагічнае можна сказаць пра турнір, што прайшоў у Латвіі ў 2006-м. З тых часоў у нас і нашых суседзяў існавала жаданне вярнуць гэтыя спаборніцтвы ў свае краіны. Таму сёлета мы разам вырашылі падысці да гэтага пытання як партнёры. У Беларусь прыехала дэлегацыя з Латвіі, якая сустрэлася з кіраўніком дзяржавы, пасля чаго было дадзена даручэнне аб прапрацоўцы гэтага пытання. Спадзяюся, што наш праект стане прыкладам узаемавыгаднага трансгранічнага еўрапейскага супрацоўніцтва.

**Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэй ШОРАЦ** адзначыў, што праводзіць у беларускай сталіцы спартыўныя спаборніцтвы міжнароднага ўзроўню стала добрай традыцыяй. Ужо ў 2019 годзе ў горадзе пройдуць Еўрапейскія гульні, якія вымагаюць сур'ёзнай падрыхтоўкі. Рашэнне Міжнароднай федэрацыі хакея на карысць беларуска-латвійскай прапановы, на думку мэра, таксама стала б гонарам, беручы пад увагу наяўную інфраструктуру і вопыт арганізацыі падобных турніраў.

Адзначаецца, што ў выпадку перамогі сумеснай заяўкі паўфінальныя сустрэчы і фінал чэмпіянату пройдуць у беларускай сталіцы. На групавым этапе на «Мінск-Арэне» будзе гуляць зборная Беларусі, адпаведна на «Арэне Рыга» — Латвіі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# ЗНОЎ ЗАЦВІТУЦЬ КАШТАНЫ?

## Елкі не кранулі па просьбе гамяльчан

Вядома, што грамадзяне вельмі востра рэагуюць на выдаленне любога дрэва — нават па неабходнасці. Рыгор Туравец растлумачвае, што калі гэта адбываецца, прычыны заўсёды абгрунтаваныя: дрэва камісія прызнаецца аварыйным ці хворым, або такая неабходнасць узнікае пры рамонце і будаўніцтве. Між тым закон прадугледжвае правядзенне абавязковых кампенсацыйных пасадак.

— Па магчымасці новае дрэва высаджваецца ў тым жа месцы, але калі такога варыянту няма, месца для яго вызначаецца адміністрацыяй раёна. Узамен выдаленых аб'ектаў расліннага свету праводзяцца кампенсацыйныя пасадкі ў суадносінах прыкладна 2:1. Такім чынам захоўваецца высокі ўзровень азелянення горада над Сожам, — дадаў **першы намеснік генеральнага дырэктара Гомельскай гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

**Намеснік кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля Аляксандр ГЕРМАНАЎ** расказаў, што пры рамонце будынка чыгуначнага вакзала кіраўніцтва Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі звярнулася ў адміністрацыю раёна з просьбай выдаліць елкі ўздоўж будынка дзеля новага сучаснага дызайну навакольнай тэрыторыі. Аднак падчас грамадскага абмеркавання жыхары выказаліся супраць такой ініцыятывы, і дрэвы захавалі. Чыгуначнікі вымушаны былі ўнесці карэктывы ў эскіз афармлення тэрыторыі. У выніку з'явіліся прыгожыя кампазіцыі вакол елак.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## Сёння — ліпы, заўтра — каштаны

— Між тым летась у кастрычніку на прадпрыемстве «Чырвоны гваздзік» быў закладзены гадавальнік каштанаў, — паведаміў **выконваючы абавязкі дырэктара ДКСУП «Чырвоны гваздзік» Сяргей БАГАЛЮБСКІ.**

Усе ведаюць, што зусім нядаўна каштаны былі знакавай адметнасцю Гомеля. Яны раслі ўсюды на вуліцах, у парках, скверах, дварах. Аднак апошнія некалькі гадоў гарадскія каштаны сталі хварэць і з гэтай прычыны іх вымушаны былі масава выдаляць. Цяпер супрацоўнікі вырошчваюць некалькі тысяч саджанцаў каштанаў вядуць вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук.

— Навукоўцы даказалі, што максімальны тэрмін жыцця каштанаў у гарадскім асяроддзі — 18—20 гадоў, — адзначае Рыгор Туравец. — Мяркуецца, што сумеснымі намаганнямі атрымаецца вывесці дрэва, якое будзе больш устойлівым да ўздзеяння негатыўных умоў навакольнага асяроддзя ў мегаполісе. А гадоў праз 7-8 іх высадзяць у адкрыты грунт. Такім чынам Гомель зноў стане горадам каштанаў. Таксама на прадпрыемстве закладзена шмат відаў туі, ядлоўцу, іншых раслін. Яны ў недалёкай будучыні змогуць упрыгожыць гарадскую прастору.

Пакуль жа ў Гомелі часцей садзяць не такія капрызныя да небяспечных экалагічных умоў ліпы і клёны. Менавіта гэтым пародам дрэў будзе аддавацца перавага падчас азелянення і сёлета. Спецыялісты адзначаюць, што яны прыжываюцца лепш за іншых.

## Пасадкі з розумам і дазволам

Падчас круглага стала адзначылі, што многія гараджане актыўна ўдзельнічаюць у добраўпарадкаванні — у тым ліку ў аглядах-конкурсах на лепшую сядзібу, лепшы двор, лепшы балкон. Бывае, што людзі па ўласнай ініцыятыве высаджваюць дрэвы ў дварах, каля сваіх дамоў. Часта з мэтай, каб насаджэнні сталі перашкодай для паркоўкі машын на газонах.

Але тут, заўважаюць спецыялісты, трэба дзейнічаць разумна. Бо пасадка дрэў павінна весціся з улікам асабліваcцяў месца, глебы, наяўнасці ахоўнай зоны... Таму ўсім, хто хоча зрабіць свой унёсак у азеляненне, раяць перш звярнуцца да спецыялістаў па дазвол і кансультацыю.

Прывялі прыклады і варварскіх адносін да зялёных насаджэнняў. Не адзінкавыя выпадкі, калі людзі выкрадаюць расліны і перасаджваюць іх на асабістыя прысядзібныя ўчасткі. Нядбайныя кіроўцы заязджаюць на зялёныя зоны, а клапатлівыя бабулькі кормяць птушак на кветніках. Пакутуюць і ўстановы, якія ўпрыгожылі свае фасады кашпо з кветкавымі кампазіцыямі.

## Клімат дазваляе экзотыку

Гамяльчане сёлета пабачаць на вуліцах горада экзатычныя расліны. Спецыялісты будуць эксперыментаваць з паўднёваафрыканскімі і паўднёваамерыканскімі кветкамі. **Начальнік аддзела добраўпарадкавання даччынага камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Чырвоны гваздзік» Ларыса ЗЕЛЯНКОЎСКАЯ** расказала, што на кветніках высадзяць астэаспермум і калібрахаа.

**Усім, хто хоча зрабіць свой унёсак у азеляненне, раяць перш звярнуцца да спецыялістаў па дазвол і кансультацыю.**

— Мы імкнёмся заўсёды працаваць з новымі відамі раслін. Улічваючы пацяпленне клімату, у новым сезоне вырашана высадзіць расліны, якія звычайна растуць у Паўднёвай Афрыцы і Паўднёвай Амерыцы. Пакуль складана сказаць, як кветкі адрэагуюць на беларускія кліматычныя ўмовы, для гэтага неабходна паназіраць за імі год-два. Самымі папулярнымі, знаёмымі і любімымі ўсімі, па-ранейшаму з'яўляюцца петуніі, ружы, віёлы, бягоніі, цюльпаны... Сёлета гамяльчан таксама будуць цешыць розныя віды аксамітак. На замовах прадпрыемстваў распрацоўваюцца эскізы кветкавага афармлення офісаў і гандлёвых аб'ектаў. Усё больш жыхароў, якія маюць жаданне ўпрыгожыць свае балконы кветкавымі кампазіцыямі, — расказала Ларыса Зелянкоўская.

Кветак увогуле, як і летась, у Гомелі плануюць высадзіць больш чым пазмілёна. Апроч таго, жыхароў і гасцей горада будуць здзіўляць арыгінальным афармленнем зялёных зон, новымі формамі вертыкальнага азелянення, незвычайнымі кветкавымі аб'ектамі і кампазіцыямі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Профі

# ГІПАКРАТЫ Ў ПАГОНАХ

## Карэспандэнты «Звязды» на свае вочы ўбачылі, як становяцца ваеннымі ўрачамі



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Выманне параненага з бранятэхнікі — адзін з найбольш складаных элементаў, які выконваецца пад агнём праціўніка.

**Ваенна-медыцынскі факультэт Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта — адзінае месца ў краіне, дзе рыхтуюць ваенных урачоў. За больш чым два дзесяцігоддзі існавання з яго сцен выйшла больш за 500 выпускнікоў. Сёння гэта кіраўнікі медыцынскіх службаў сілавых ведамстваў, начальнікі медыцынскіх службаў вайсковых часцей, начальнікі кафедраў ваенна-медыцынскага факультэта і ваенных кафедраў медыцынскіх універсітэтаў, аддзяленняў ваеннага шпіталя і цывільных бальніц, таленавітыя ўрачы, якія штодзённа стаяць на варце нашага здароўя, а часам і жыцця.**

Прафесія ўрача заўжды была высакароднай. І сёння насіць белыя халаты мае гонар не кожны. А тым больш, калі пад халатам яшчэ і пагоны.

### АДНА ПРАФЕСІЯ — ДЗВЕ КЛЯТВЫ

Нягледзячы на тое, што ў курсантаў поўным ходам ідзе сесія і канікулы не за гарамі, такое ўражанне, што навучанне на ваенна-медыцынскім факультэце не спыняецца ні на секунду. Будучыя ўрачы асвойваюць асновы хірургіі за аперацыйным сталом, практыкуючыя — удасканальваюць сваё майстэрства падчас заняткаў па экстрэмальнай медыцыне.

Навучанне ваенных урачоў на факультэце адбываецца на чатырох кафедрах: арганізацыі медыцынскага забеспячэння войскаў і экстрэмальнай медыцыны, ваеннай эпідэміялогіі і ваеннай гігіены, ваенна-палявой тэрапіі і ваенна-палявой хірургіі. Факультэт рыхтуе не толькі ваенных урачоў для Узброеных Сіл, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў Беларусі, а і студэнтаў універсітэта па праграме падрыхтоўкі афіцэраў медыцынскай службы запасу. Таксама тут праходзяць перападрыхтоўку і павышаюць сваю кваліфікацыю як ужо практыкуючыя ўрачы, так і ваенныя фельчары. Такім чынам, на факультэце паспяхова функцыянуе сістэма бесперапыннай ваенна-медыцынскай адукацыі.



Асновы хірургіі курсанты спасцігаюць як падчас лекцый урачоў-практыкаў, так і ў перавязачнай і нават за аперацыйным сталом.

— Нашы выпускнікі даюць дзве клятвы: клятву Гіпакрата і на вернасць Радзіме, якую агучваюць падчас прыняцця Ваеннай прысягі, — гаворыць **начальнік ваенна-медыцынскага факультэта БДМУ, палкоўнік медыцынскай службы, доктар медыцынскіх навук, прафесар Васіль БОГДАН.** — Акрамя таго, што павінны ведаць цывільныя ўрачы, яны асвойваюць ваенныя і ваенна-медыцынскія дысцыпліны. У больш пашыраным варыянце вывучаюць паталогію, звязаную з баявымі дзеяннямі, хірургічную траўму, ваенна-палявую тэрапію. Арганізацыя і правядзенне мерапрыемстваў медыцынскага забеспячэння воінскіх часцей і падраздзяленняў ва ўмовах баявой абстаноўкі і паўсядзённай дзейнасці — гэтыя веды, безумоўна, спатрэбяцца нашым курсантам пры праходжанні воінскай службы.

Першасныя вайсковыя пасады выпускнікі факультэта займаюць пасля інтэрнатуры. У войскі маладыя ўрачы трапляюць ужо старшымі лейтэнантамі медыцынскай службы. Званне лейтэнанта прысвойваецца ім пасля заканчэння 5 курса.



### НАВУКОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ СУСВЕТНАГА ЎЗРОЎНЮ

Ваенна-медыцынскі факультэт займаецца падрыхтоўкай і кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі. Ад'юнктура адкрыта па спецыяльнасцях «тэрапія», «хірургія» і «ваенная медыцына».

— Людзей, у якіх ёсць схільнасць да навуковай дзейнасці, мы імкнёмся заўважыць яшчэ ў працэсе навучання, — расказвае начальнік ваенна-медыцынскага факультэта. — Трапіўшы ў так званы рэзерв навуковых кадраў, яны спрабуюць свае сілы пры напісанні студэнцкіх работ, навуковых артыкулаў, якія ў далейшым могуць вырасці ў кандыдацкую або доктарскую дысертацыю. І такія прыклады ёсць.

Як адзначае **намеснік начальніка ваенна-медыцынскага факультэта па вучэбнай і навуковай рабоце, палкоўнік медыцынскай службы Алег ІШУЦІН,** навуковы патэнцыял прафесарска-выкладчыцкага складу ваенна-медыцынскага факультэта адзін з самых высокіх сярод ваенных факультэтаў. «Працэнт атрымання вучоных ступеняў — 60%, — падкрэслівае кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт. — Сярод выкладчыкаў — 7 дактароў і 18 кандыдатаў медыцынскіх навук, 6 прафесараў і 11 дацэнтаў. Гэта ўрачы-практыкі, якія штодзённа выконваюць аперацыі, перавязкі, кансультуюць пацыентаў, ажыццяўляюць вялікі аб'ём лячэбнай работы».

Дарэчы, абарона кандыдацкай або доктарскай дысертацыі з прысваеннем навуковага звання на ваенна-медыцынскім факультэце адбываецца штогод. Прычым абгрунтаваць вынікі свайго даследавання — толькі паўсправы. Важна яшчэ пацвердзіць іх унікальнасць. Прапанаваныя метады дыягностыкі і лячэння той ці іншай паталогіі апрабуюцца ў лячэбных установах і афармляюцца ў выглядзе інструкцыі па прымяненні, якая зацвярджаецца Міністэрствам аховы здароўя, пасля чаго рэгламентуецца да прымянення ва ўсіх лячэбных установах нашай дзяржавы незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

**Распрацоўкай новага жгута беларускія навукоўцы ў галіне ваеннай медыцыны не толькі не саступаюць, а нават пераўзыходзяць існуючыя ў свеце аналагі.**

З апошніх распрацовак выкладчыкаў факультэта — новы турнікет (аналаг жгута) для спынення вонкавага крывацёку. Распрацоўкай зацікавіліся на беларускім прадпрыемстве «Стужка». У выніку была выраблена пробная партыя, якая прайшла сертыфікацыю як выраб медыцынскага прызначэння. Распрацоўкай новага жгута беларускія навукоўцы ў галіне ваеннай медыцыны не толькі не саступаюць, а нават пераўзыходзяць існуючыя ў свеце аналагі.

На думку начальніка факультэта, навуковыя даследаванні абавязкова павінны быць запатрабаванымі. Не выпадкова ўсе тэматыкі дысертацый, якія абараняюцца на факультэце, актуальныя як для Узброеных Сіл, так і для Міністэрства аховы здароўя. І аб гэтым сведчыць хоць бы той факт, што лепшай доктарскай дысертацыяй у галіне медыцыны за 2015 год была прызнана навуковая работа, абароненая на ваенна-медыцынскім факультэце. Аўтар — яго кіраўнік Васіль Богдан.

### ХІРУРГАМІ СТАНОВЯЦЦА Ў АПЕРАЦЫЙНАЙ

Пасля заканчэння ваенна-медыцынскага факультэта ў армію прыходзяць не проста афіцэры, а высакакласныя спецыялісты. Гэта толькі здаецца, што ў іх мала вопыту. Насамрэч, ужо пачынаючы з першага курса, курсанты спасцігаюць практычную медыцыну на базе 432-га Галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Узброеных Сіл, 2-й і 4-й клінічных бальніц сталіцы, дзе функцыянуюць факультэцкія кафедры.

У адным з пакояў кафедры ваенна-палявой хірургіі 2-й гарадской клінічнай бальніцы, у якім звычайна праходзяць тэарэтычныя заняткі, з раніцы было пуста. І не таму, што курсанты любяць паспаць. Будучыя ўрачы знаходзіліся ў аперацыйнай.

— Падчас хірургічных умяшанняў курсанты і слухачы факультэта заўсёды асіснуюць мне, — кажа **асістэнт кафедры ваенна-палявой хірургіі ваенна-медыцынскага факультэта, падпалкоўнік медыцынскай службы, кандыдат медыцынскіх навук Дзмітрый КЛЮЙКО.** — Якая аперацыя ні была б па складанасці, я не маю магчымасці прыступіць да яе з такім жа, як і я, урачом. Кожны курсант і студэнт, а тым больш інтэрн ці клінічны ардынатар, павінен як мага больш працаваць рукамі. Такая асаблівасць нашай кафедры.

Дзмітрый Клюйко — не толькі таленавіты выкладчык, а і практыкуючы хірург. Як ён сам прызнаўся, урачом хацеў быць заўсёды. У свой час яго спакусіла і рамантыка ваеннай службы, і цяпер ні ў якай іншай прафесіі, акрамя як у ваеннай медыцыне, ён сябе не бачыць.

— Што адрознівае ваеннага ўрача ад цывільнага? — паўтарае маё пытанне Дзмітрый Клюйко і тут жа адказвае: — Уменне прымаць рашэнне пры масавым паступленні пацярпелых. Каб мінімізаваць страты, ваенны ўрач павінен працаваць з некалькімі пацыентамі адначасова.

І ён гэта ведае не па падручніках або аповедах старэйшых калег. Менавіта Дзмітрый Клюйко і яго калегі па 2-й клінічнай бальніцы аказвалі дапамогу пацярпелым падчас тэракта ў мінскім метро.



### ДАПАМАГЧЫ САБЕ І ІНШЫМ

У сувязі з апошнімі падзеямі ў свеце ўсё больш актуальнай становіцца экстрэмальная медыцына. Як аказваць першую дапамогу падчас баявых дзеянняў і надзвычайнай сітуацыі, вучаць на кафедры арганізацыі медыцынскага забеспячэння войскаў і экстрэмальнай медыцыны. Карэспандэнты «Звязды» пазнаёміліся толькі з некалькімі спосабамі.

Адным з найбольш складаных элементаў, які выконваецца пад агнём праціўніка, з'яўляецца выманне параненага з бранятэхнікі. Прынцып дзеяння ў падобнай сітуацыі гэтым разам адпрацоўвалі выкладчыкі ваенных навучальных установ, якія будуць прыцягваць да правядзення заняткаў па ваенна-медыцынскай падрыхтоўцы з курсантамі.

— Усе заняткі па ваенна-медыцынскай падрыхтоўцы павінны праводзіцца ў поўнай баявой экіпіроўцы ці хоць бы ў мінімальнай камплектацыі: бронекамізэлька, шлем і аўтамат, што нашмат ускладняе любыя дзеянні, у тым ліку па аказанні дапамогі, — лічыць **начальнік кафедры арганізацыі медыцынскага забеспячэння войскаў і экстрэмальнай медыцыны, палкоўнік медыцынскай службы, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Андрэй СТРЫНКЕВІЧ.** — Тое, што яшчэ нядаўна ўяўляла сабой ваенна-медыцынская падрыхтоўка, — уменне накласці павязку — гэта прыём, які выконваецца ўжо ў зоне сховішча. Тыя метады аказання першай дапамогі, якімі ва ўмовах бою, акрамя павязкі, павінен валодаць любы ваеннаслужачы, фізічна выконваць вельмі цяжка. Накласці сабе жгут у класе — лягчэй лёгкага, пад агнём праціўніка ды яшчэ будучы ў бронекамізэльцы, максімальна прыціскаючыся да зямлі, — складана тэхнічна. Прычым нельга забываць, што задачу ўскладняюць хваляванне і стрэс.

Улічваючы, што галоўнае ва ўмовах бою — выканаць пастаўленую задачу, ды і наўрад ці ў такой абстаноўцы можна разлічваць на дапамогу навакольных, вайскоўцаў у першую чаргу вучаць, як правільна аказаць першую дапамогу сабе.

Па меркаванні ад'юнкта кафедры, маёра медыцынскай службы Сцяпана Саўчанчыка, жыццё параненага залежыць ад таго, хто першы і, галоўнае, як накладзе жгут. «А колькі такіх прыкладаў, калі несвоечасова накладзены жгут або няўменне гэта рабіць са спадручных сродкаў каштавала чалавеку жыцця, — кажа ваенны ўрач. — Элементарныя веды па аказанні першай дапамогі — тое, што патрэбна кожнаму, каб пры неабходнасці захаваць чалавеку жыццё».

**Вераніка КАНЮТА.**
kanyuta@zviazda.by

■ Ноу-хау

# БЛІЖЭЙ ДА АСВЕТЫ

## Гандлёва-вытворчае ўпраўленне пры Міністэрстве абароны плануе адрадзіць Дом ваеннай кнігі

**Фірменная крама «Зорачка», што знаходзіцца ў Доме ваеннага адзення, традыцыйна карыстаецца папулярнасцю сярод людзей у пагонах. Каб набыць новую фуражку, пагоны, шаўроны, эмблемы і іншую вайсковую атрыбутыку, якую не знойдзеш у звычайнай прамысловай краме, яны едуць сюды з розных канцоў сталіцы.**

Вядома, падобныя крамы ёсць і ў некаторых мінскіх раёнах, і ў іншых гарадах. Толькі наўрад ці іх асартымент задаволіць інтарэсы прадстаўнікоў усіх сілавых структур краіны. сябе шмат цікавага. Гэта і літаратура па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, зборнік стралковай зброі, прыгожыя альбомы з беларускімі краявідамі...

На чым спыніцца, у юнака ёсць яшчэ час падумаць. У фірменнай краме гандлёва-вытворчага ўпраўлення пры Міністэрстве абароны ён бывае часта. Арцём — паштальён часці, якая знаходзіцца побач.

«У краме можна знайсці ўсё, што неабходна вайскоўцу, — гаворыць хлопец. — Асабліва гэта актуальна для новага папаўнення. Ніколі не адмаўляю, калі нехта з ваеннаслужачых папросіць мяне нешта набыць, таму часам хаджу сюды з цэлым спісам».

Кніжная секцыя ў «Зорачцы» з'явілася не так даўно. кніжны аддзел. Цяпер, каб набыць добрую кнігу, неабавязкова спецыяльна некуды ісці. У перспектыве мы плануем адрадзіць Дом ваеннай кнігі, які раней у Мінску існаваў. У гэтай спецыялізаванай кнігарні будзе прадстаўлена ўся падборка сучаснай літаратуры па ваеннай тэматыцы.

Паколькі фірменная крама працуе пры Доме ваеннага адзення, нядзіўна, што **і кан'юнктуры рынку гандлёва-вытворчага ўпраўлення пры Міністэрстве абароны Вольга БОНДАРАВА.** — У адносна невялікай сумачцы адначасова могуць змяшчацца сродкі гігіены, ручнік, камплект запасной бялізны, швейная фурнітура, сутачны сухі паёк і нават кубак са сталовымі прыборамі. Цэласнасць і чысціню прадметаў забяспечвае ахоўная



Фота Надзеі БУЖАН.

Армейскі несэсэр, або «трывожны чамадан», — вельмі зручная рэч для вайскоўца.



У кніжнай секцыі «Зорачкі» можна знайсці цікавую кнігу на ваенную тэматыку і не толькі.

Пакуль карэспандэнты «Звязды» вывучалі тавары, якія прапануе «Зорачка», у краму завітала з дзясятак чалавек. Міліцыянеры прыйшлі сюды па атрыбуты, якія ўпрыгожаць іх форму. Мужчыны ў цывільным прыглядаліся да вайсковых берцаў. А салдат тэрміновай службы, набыўшы сабе «мушкі» на каўнерыкі, спыніўся побач з кніжнай секцыяй.

Пагартаўшы старонкі кніг, ваеннаслужачы батальёна камандавання Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Арцём Рабкевіч знайшоў для

У асноўным, тут прадстаўлена літаратура ваенна-гістарычнай і ваенна-патрыятычнай скіраванасці, якую прапануюць айчынныя выдавецтвы. Чым не добры падарунак для чалавека ў пагонах або ад яго?

— Сучасныя мужчыны вельмі занятыя, таму ў іх няма часу, каб хадзіць па кнігарнях, — лічыць **начальнік сектара маркетынгу і кан'юнктуры рынку гандлёва-вытворчага ўпраўлення пры Міністэрстве абароны Людміла ЛЕБЕДЗЕВА.** — Невыпадкова мы вырашылі ўладкаваць у нашай «Зорачцы»

значную частку асартыменту складаюць рэчы ўласнай вытворчасці. Прычым тут можна знайсці не толькі ваенную форму, фуражку, бялізну і іншыя прадметы з гардэроба прадстаўніка сілавога ведамства. На паліцах «Зорачкі» — і эксклюзіўныя рэчы. Напрыклад, сувенірная прадукцыя ў выглядзе мініяцюрных фуражак, будзёнавак і пілотак, незвычайныя камплекты ваеннай формы, пашытыя спецыяльна для рэспубліканскага фестывалю-конкурсу моды і фота «Млын моды».

Мы ўжо пісалі пра сумку прызыўніка, якая карыстаецца папулярнасцю ў тых, хто збіраецца папоўніць рады Узброеных Сіл. Адна з апошніх навінак гандлёва-вытворчага ўпраўлення — армейскі несэсэр, або па вайсковаму «трывожны чамадан».

— Такі чамадан вельмі зручны ў побыце афіцэра, — расказвае **вядучы спецыяліст сектара маркетынгу**

плёнка, што раздзяляе кожны з аддзелаў чамадана, тканіна якога, дарэчы, непрамакальная. Прычым некаторыя аддзелы адшпільваюцца, што дадае больш зручнасці пры выкарыстанні. Напрыклад, каб пачысціць зубы, неабавязкова браць з сабой у душавую ўвесь чамадан.

Дарэчы, такую дэталь прапанавалі самі афіцэры. Увогуле, перш чым прыступіць да вытворчасці, спецыялісты ўпраўлення праводзяць цэлае даследаванне, падчас якога ўлічваюць прапановы тых, дзеля каго і будуць ствараць тую ці іншую рэч. Прыслухаўшыся да жанчын у пагонах, вытворцы выпусцілі і жаночы варыянт «трывожнага чамадана». Цікава, што цяпер ён карыстаецца попытам не толькі ў вайскоўцаў, а і ў прадстаўніц іншых сілавых структур.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Лёсы

# ВЕЧНАЯ ПАМЯЦЬ НАШЧАДКАЎ

**Перад вайной у Давыд-Гарадку існавала вялікая яўрэйская абшчына, якая складала трэцюю частку насельніцтва і налічвала каля трох тысяч чалавек. У гады Вялікай Айчыннай вайны на долю гэтага народа выпала шмат выпрабаванняў і здзекаў.**

Расстрэл яўрэяў Давыд-Гарадка быў учынены праз некалькі тыдняў пасля акупацыі горада нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941 годзе. Тады ў Давыд-Гарадок прыбыла зондэркаманда СС. А падставай для расстрэлу паслужыў данос аднаго з мясцовых здраднікаў аб тым, што давыд-гарадоцкія яўрэі рыхтуюць узброенае нападзенне на акупантаў. Эсэсаўцы тады зрабілі аблаву і забілі больш за 450 мужчын, а членаў іх сямей — жанчын, дзяцей і старых — выгналі з горада. Тыя пайшлі ў розных напрамках шукаць прытулку.

Трохі пазней, калі абстаноўка крыху нармалізавалася, некаторыя людзі вярнуліся ў Давыд-Гарадок. І хутка трапілі ў гета, якое нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі ў 1942 годзе на беразе рэчкі Сежка, прытока Гарыні. Туды зганялі яўрэяў, якія засталіся пасля карнай аперацыі 1941 года, прытым не толькі з Давыд-Гарадка, але і з суседніх вёсак: Альшан, Сямігосціч. У гета знаходзіліся пераважна жанчыны і дзеці. Ежы і вады не было. Пачаліся хваробы. Месца заключэння строга ахоўвалася, каб ніхто не змог уцячы.

З успамінаў жыхаркі Давыд-Гарадка Ніны Серафімаўны Сімановіч: «У 1941 годзе я была яшчэ дзяўчынкай, але многае з таго, што бачыла, засталося ў памяці, бо такое немагчыма забыць. Спачатку з гета немцы вывелі дзевяць чалавек. Гэта былі самыя багатыя людзі Давыд-Гарадка. Крыху пазней вывелі другую вялікую групу вязняў, якую складалі адны мужчыны. У апошнюю чаргу да месца пакарання павялі жанчын, дзяцей і старых. Шлях на Галгофу ляжаў з цэнтра горада на ўскраіну, у раён хутара Хабішча, потым ішлі да хутара Хіноўск, дзе ў лесе ўжо чакалі загадзя падрыхтаваныя ямы.






На месцы масавага пакарання яўрэяў прымушалі распранацца, складваць вопратку ў кучы, аддаваць каштоўнасці. Затым фашысты скідвалі людзей у ямы і расстрэльвалі».

Спецыяліст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Столінскага краязнаўчага музея Аляксей Вярэніч адзначае, што Хіноўск — адно з буйнейшых пахаванняў яўрэяў на Століншчыне. Сёлета мемарыяльны комплекс наведалі 46 яўрэяў з Ізраіля і Амерыкі, каб ушанаваць памяць загінулых продкаў. Нашчадкі прыязджаюць сюды за тысячы кіламетраў кожныя тры гады, каб памаліцца за душы памерлых.

Па яўрэйскай традыцыі, на магіле пакідаюць камяні з надпісамі, што сімвалізуюць вечную памяць, якая заўжды будзе жыць у сэрцах нашчадкаў.

**Марына ЛЯШКЕВІЧ**

■ Векапомнае

# Саграваала пошта палявая...

## Бацькавы лісты з фронту дачка перадала ў мясцовы музей

**Многія з нас, напэўна, ведаюць, а пры выпадку нават напяваюць адну са шматлікіх песень часоў Вялікай Айчыннай вайны. Маецца на ўвазе песня пра ваенных паштальёнаў, якія неслі вельмі патрэбную службу — падтрымлівалі сувязь паміж воінамі і іх роднымі, блізкімі. «Когда приходит почта полевая, солдат теплом далеким обогрет...»**

Саграваала душу, узнімала настрой, надавала сілы палявая пошта і майму земляку, франтавіку-пехацінцу Пятру Галдовічу. Прызваны ў армію ў ліпені 1944 года, ён ваяваў на 3-м Беларускім фронце, якому выпала вызваляць паўночна-заходнія землі Беларусі, наступаць у напрамку на Кёнігсберг, штурмаваць яго і адолець ворага ў гэтым непрыступным, на думку гітлераўцаў, горадзе-крэпасці.

Пра свае армейскія справы, нягоды і перажыванні Пётр Юльяновіч расказваў у пісьмах, якія ён адрасаваў старэйшай дачцэ Тамары. Акрамя яе, пакінуў ён дома пры маці яшчэ траіх дзяцей. Зберагла бацькавы лісты і перадала іх (а гэта каля двух дзясяткаў) у Лагойскі гісторыка-краязнаўчы музей дачка Валянціна.

У кожных з гэтых пасланняў на радзіму адчуваецца неспакой, перажыванні за сваіх родных — жонку і дзяцей. Думалася салдату, як яны без яго спраўляюцца з уборкай ураджаю. У адным з пісьмаў прызнаваўся, што дзеці сняцца кожную ноч. Выказваў запаветнае жаданне: «Скончым вайну, буду жывы — пабачымся». І разам з тым — балючае: «Не ведаю, ці ўбачымся калі, адназначна Богу ведама...»

Трывожныя прадчуванні радавога Пятра Галдовіча, на жаль, абярнуліся трагедыяй: ён памёр у шпіталі ад асколачнага ранення ў галаву 31 студзеня 1945 года.

Перш чым яго сям'я атрымала пахавальную, сумную вестку ў сваім лісце Тамары паведаміў яе стрыечны брат Канстанцін Папкоўскі, які таксама ваяваў на тым жа 3-м Беларускім фронце. Да самага апошняга моманту ён падтрымліваў праз пошту сувязь са сваім родным дзядзькам.

Франтавыя пісьмы Папкоўскага, якія таксама перададзены ў музей, вызначаюцца аптымістычнай танальнасцю, а месцамі нават лірызмам. «Твае пісьмы, Тамара, напоўнілі маё сэрца радасцю і гордасцю за вас. Апошнія з іх прачытаў на раскошным лузе каля буйнога нямецкага горада, калі варожыя салдаты здаваліся ў палон разам з танкамі, гарматамі і кухнямі. Нашы ж байцы грэліся на сонейку і бясклапотна курылі». Дарэчы, разам з чарговым пісьмом яго стрыечная сястра атрымала прысвечаныя ёй верш з такімі радкамі:

Нішто так шчасцем не асвеціць
Жыцця салдацкага майго,
Як змяты сіненькі канвергіць,
А ў ім маленькае пісьмо.

З вайны Кастусю Папкоўскаму лёсам было наканавана вярнуцца дадому і паспяхова ўладкаваць сваё асабістае жыццё. Некаторы час ён працаваў настаўнікам пачатковых класаў (да вайны скончыў дзесяцігодку), затым пераехаў у Мінск. Вучыўся ў БДУ, дзе набыў журналісцкую прафесію. Працягły час Канстанцін Папкоўскі працаваў у «Настаўніцкай газеце», дзе спаўна рэалізаваў свае творчыя здольнасці.

**Віктар НЕСЦЯРОВІЧ,** *г. Лагойск*

■ Паспей паглядзець!

# МУЖНАСЦЬ З ЭФЕКТАМ ЗБРОЕВАЙ СТАЛІ

**З учарашняга дня ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны працуе выстаўка «Зброя Перамогі». Такім чынам, працягваецца фотапраект, арганізаваны рэдакцыяй газеты «Гомельскія ведамасці» і Гомельскім абласным музеем ваеннай славы да 70-годдзя Вялікай Перамогі.**

На фотаздымках — ветэраны са зброяй у руках. Менавіта з ёй (цяпер гэта музейныя экспанаты) яны вызвалялі нашу краіну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, змагаліся за будучыню свайго народа на чужыне.

За кожнай вінтоўкай і кулямётам, артылерыйскім і танкавым выстралам, кінутай гранатай і гулам самалёта схаваны лёс чалавека, у руках якога зброя і тэхніка ў жорсткім баі з ворагамператвараліся ў магутную сілу. Кожнаму з герояў праекта — не менш як 90 гадоў. Але і сёння, поўныя бадзёрасці і аптымізму, ветэраны на сваім прыкладзе вучаць маладое пакаленне змагацца з жыццёвымі цяжкасцямі.

Дапаўняюць экспазіцыю газетныя старонкі, што распавядаюць пра франтавікоў, чые воля і мужнасць па сваёй моцы не саступалі зброевай сталі. Пазнаёміцца з ветэранамі, якія шмат гадоў таму прайшлі дарогамі вайны, можна па 26 лютага ўключна. Наведванне выставы — па ўваходным білеце ў музей

■ Прававая гасцёўня

# АЛІМЕНТЫ МОЖНА ВЫПЛАЧВАЦЬ ЯК ГРАШЫМА, ТАК І МАЁМАСЦЮ

## Асаблівасці добраахвотнага пагаднення аб утрыманні непаўналетніх

***З бацькам майго непаўналетняга сына мы не распісаны, аднак ён дае грошы на ўтрыманне малога. Мы хацелі б пісьмова аформіць дамоўленасць па пытанні матэрыяльнага забеспячэння дзіцяці. Ці магчыма зрабіць гэта добраахвотна, без звароту ў суд? Яшчэ хацелася б даведацца, ці можна адлюстраваць у гэтым дакуменце нейкія дадатковыя ўмовы, каб забяспечыць нашага сына ўсімі правамі адносна магчымасці атрымання грашовай дапамогі ад бацькі, асабліва калі ў яго з'явяцца яшчэ іншыя дзеці?***

**Раіса П.**, *г. Паставы, Віцебская вобл.*



На пытанні адказвае **Вольга КОЗЕЛ, кансультант упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— Паколькі ў гэтай сітуацыі бацька добраахвотна выконвае абавязкі па ўтрыманні непаўналетняга сына, пры складанні пісьмовай дамоўленасці пра гэта можна абысціся без суда.

Заканадаўства дазваляе заключыць пагадненне аб утрыманні сваіх непаўналетніх і (або) непрацаздольных паўналетніх дзяцей, што маюць патрэбу ў дапамозе, — так званае Пагадненне аб выплаце аліментаў (далей — Пагадненне). Гэта магчыма, калі няма судовай пастановы (што ўступіла ў законную сілу), дзе вырашаны пытанні выплаты аліментаў, а таксама калі аліменты не выплачваюцца адпаведна ўмовам Шлюбнага дагавора ці Пагаднення аб дзецях.

Азначанае Пагадненне дазваляе без удзелу суда вызначыць парадак, форму, спосаб і ўмовы прадстаўлення ўтрымання дзецям, памер сродкаў на ўтрыманне непаўналетніх (аліменты). Пры гэтым яно не павінна парушаць правы і інтарэсы дзіцяці. Дакумент заключаецца пісьмова і патрабуе натарыяльнага засведчання.

Пагадненне заключаецца паміж асобай, абавязанай выплачваць аліменты, і асобай, якая будзе іх атрымліваць. Як правіла, гэта бацькі дзіцяці. Аднак Пагадненне можа быць аформлена таксама паміж адным з бацькоў (плацельшчыкам аліментаў) і дзіцем ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў са згоды законнага прадстаўніка (другога з бацькоў, усынавіцеля, апекуна), а пры адсутнасці такіх асоб — органа апекі і папячыцельства.

Пагадненне пачынае дзейнічаць пасля яго натарыяльнага засведчання. Выключэннем з'яўляецца Пагадненне або яго асобныя ўмовы, у адпаведнасці з якімі ва ўласнасць дзіцяці перадаецца нерухомая маёмасць. Гэтыя палажэнні будуць уступаць у сілу пасля дзяржаўнай рэгістрацыі згаданага дакумента.

### Індэксацыя аліментаў і іх выплата паўналетнім

У Пагадненні можна прадугледзець шэраг дадатковых дамоўленасцяў адносна спосабу, памеру, умоў і парадку выплаты сродкаў на ўтрыманне дзіцяці. Могуць таксама акрэсліваецца формы і ўмовы наступлення адказнасці, калі абавязацельствы ў адпаведнасці з гэтым дакументам не выконваюцца або выконваюцца неналежным чынам.

Ва ўзгаданым дакуменце можа быць вызначаны памер аліментаў не ніжэй за суму аліментаў, якая спаганяецца ў судовым парадку ў адпаведнасці з часткай першай артыкула 92 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і.

Пагадненне дазваляе ўстанавіць дадатковыя ўмовы ўтрымання дзіцяці. У прыватнасці, можна прадугледзець выплату грошай і паўналетняму падчас яго навучання.

Згодна з законам, аліменты можна выплачваць:

у працэнтных адносінах да заробку і (ці) іншага даходу аднаго з бацькоў, які мусіць плаціць аліменты;

у цвёрдай грашовай суме, якая выплачваецца перыядычна;

у цвёрдай грашовай суме, якая выплачваецца аднаразова;

шляхам перадачы маёмасці ва ўласнасць дзіцяці.

Хачу падкрэсліць, што вы можаце абраць любы, найбольш аптымальны спосаб з пералічаных, а таксама прадугледзець іх спалучэнне. Напрыклад, устанавіць памер аліментаў у цвёрдай грашовай суме, якая падлягае выплаце штомесяц, і дадаткова перадаць ва ўласнасць дзіцяці нейкую маёмасць, што належыць плацельшчыку аліментаў.

Пры першых двух вышэйзгаданых спосабах аліменты будуць выплачвацца перыядычна (штотыднёва, штомесяц, кожны квартал і іншае), што трэба ўрэгуляваць у Пагадненні.

У гэтым дакуменце можна акрэсліць таксама парадак індэксацыі памеру аліментаў, якія выплачваюцца ў цвёрдай грашовай суме. Калі гэты момант у Пагадненні не абумоўлены, то індэксацыя будзе праводзіцца прапарцыянальна павелічэнню базавай велічыні.

Пагадненнем вызначаецца канкрэтная форма выплаты аліментаў. Іх можна перадаваць наяўнымі сродкамі непасрэдна асобе, якая атрымлівае аліменты, або пералічваць безнаяўна на банкаўскі рахунак.

### Штраф за пратэрміноўку

Мэтазгодна прадугледзець адказнасць плацельшчыка аліментаў за невыкананне або неналежнае выкананне дагаворных абавязацельстваў. Напрыклад, устанавіць няўстойку (штраф, пеня) за пратэрміноўку плацяжоў.

Калі сродкі на ўтрыманне малога не выплачваюцца добраахвотна ў адпаведнасці з умовамі, Пагадненне можна выканаць прымусова. Згодна з заканадаўствам Беларусі, гэты дакумент належыць да тых, што не патрабуюць дадатковага прызнання. Абапіраючыся на Пагадненне, суд выдасць выканаўчы дакумент, які стане падставай для прымусовага спагнання сродкаў. Пры выдачы выканаўчага надпісу суд правярае законнасць Пагаднення і выносіць матываваную пастанову аб выдачы ці адмове ў выдачы выканаўчага надпісу.

**Заканадаўства дазваляе заключыць пагадненне аб утрыманні сваіх непаўналетніх і (або) непрацаздольных паўналетніх дзяцей, што маюць патрэбу ў дапамозе, — так званае Пагадненне аб выплаце аліментаў.**

Пагадненне можа быць зменена ці скасавана па ўзаемнай згодзе бакоў у любы час. Пры гэтым заканадаўствам устаноўлены асаблівасці яго змянення ці скасавання, якія прадугледжваюць перадачу маёмасці ва ўласнасць дзіцяці. Азначаны дакумент можна змяніць ці скасаваць са згоды органаў апекі і папячыцельства, а ў выпадку набыцця непаўналетнім дзеяздольнасці ў поўным аб'ёме — са згоды дзіцяці. Змяненне або скасаванне Пагаднення патрабуе натарыяльнага засведчання.

Калі бакі не дасягнулі дамоўленасці пры істотным змяненні матэрыяльнага або сямейнага становішча ўдзельнікаў дакумента, то змяніць ці скасаваць яго можна праз суд. Пры разглядзе справы суд мае права ўлічваць любы інтарэс бакоў, які заслугоўвае ўвагі, у тым ліку ўзяцце шлюбу, нараджэнне іншых дзяцей, звальненне з работы.

**Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы.**

■ Чулі?!

# «АРЭНА» НА КАНАЦЕ

**Мазырскі цэнтр цыркавога мастацтва «Арэна» другі год запар будзе прадстаўляць Беларусь на самым прэстыжным міжнародным юнацкім цыркавым фестывалі «Новае пакаленне», які адбудзецца з 4 па 5 лютага ў горадзе Монтэ-Карла. Летась трыа паветраных гімнастаў прывезла з княства Манака спецыяльныя прызы. Сёлета ў Монтэ-Карла будуць выступаць канатаходцы «Арэны».**

У нумары ўдзельнічаюць артысты ад 13 да 20 гадоў. Беларусы плануюць здзівіць журы і публіку неверагодна складанымі трукамі: праехаць па канаце на роліках, на адным коле, прайсці з партнёрамі на плячах, а затым — з заплюшчанымі вачыма. Усе гэтыя і іншыя трукі выконваюць падлеткі. Зрабіць падобнае ніхто з іх аднагодкаў на постсавецкай прасторы пакуль не спрабаваў. Між тым на міжнародным фестывалі ў Кіеве, які праходзіў летась, нумар канатаходцаў ужо атрымаў Гран-пры.

Нумар складаны тэхнічна, таму абсталяванне для яго будзе дастаўляцца ў Манака з Мазыра. З сабой бяруць і майстра, які гэта зробіць прафесійна. **Мастацкі кіраўнік студыі цыркавога мастацтва «Арэна» Марыя КУЗНЯЦОВА** гаворыць, што спрабавалі па сваім цыркавым вопыце ўзнавіць нумар знакамітых савецкіх канатаходцаў Валжанскіх:

— Вядома, мы ўнеслі сюды вельмі шмат сваіх сакрэтаў, сваіх новых трукаў. Тых, каго адзначаюць на конкурсе ў Монтэ-Карла, звычайна чакае поспех у будучыні, бо на гэтым фестывалі прысутнічаюць, як правіла, усе знакамітыя імпрэсарыя свету.

Мазырскай цыркавой студыі — дзесяць гадоў. Аматарскі калектыў паспяхова гастралюе па краіне і дае да пяці сур'ёзных канцэртаў у месяц. Чатырнаццаць юных артыстаў з'яўляюцца лаўрэатамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** ОАО «АТЭК» г. Витебск, ул. Терешковой, д. 11, 8 (0212) 26-12-10

Лот №1. Капитальное строение с инв. №250/С-1974, площадью 941 кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание отдыха водителей с административно-бытовым корпусом и ремонтной мастерской, по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Пролетарская, 1; Капитальное строение с инв. №250/С-1979 площадью 27,5 кв. м, назначение – здание проходной, наименование – здание проходной, по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Пролетарская, 1/1; Капитальное строение с инв. №250/С-1980 площадью 11,2 кв. м, назначение – здание теплового пункта, наименование – здание теплового пункта, по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Пролетарская, 1/2; Капитальное строение с инв. №250/С-38492, протяженность – 68,8 м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – канализационная сеть, по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Пролетарская, 1; Капитальное строение с инв. №250/С-38493, протяженность – 35 м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть, по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Пролетарская, 1. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым №243500000001000249 площадью 0,9518 га. Нач. цена: 212 520 руб. без НДС. Задаток: 21 252 руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 22.02.2017 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 23.01.2017 с 8.30 по 21.02.2017 до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Обременения: договора аренды сроком по 31.03.2017

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЗАО «МТБанк» г. Минск, г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже права аренды земельного участка для строительства административно-торгового объекта в районе дома по ул. Замковая, 12 в городе Гродно 14 февраля 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Замковая, 12 | 0,1484 | 440100000002009013 | 121 754,81 | 12 500,0 | 2 512,41 | Строительство административно-торгового объекта (3-этажное здание с мансардным этажом или со скатной кровлей) |

* – земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 №49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** Доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо:** Паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона.

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 14 февраля 2017 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.**

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет №57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 23 января по 8 февраля 2017 года**.

Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Клецкого райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания кондитерского цеха, общ. пл. 133,6 кв. м, инв. № 641/С-13694, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622584505101000607, площадью 0,0637 га (предоставлен на праве аренды) по адресу: Минская область, Клецкий район, Синявский с/с, ул. Шоссейная, 14. Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона р. Нача пл. 0,0637 га; охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 Вт пл. 0,0150 га.**

**Начальная цена с НДС – 29 880,00 бел. руб. (298 800 000 бел. руб.) Задаток 10% от начальной цены (2 988,00 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **21.02.2017** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.02.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

УНН 600123737

# ЦІ МАГЧЫМАЯ ШКОЛА БЕЗ ВЫХАВАННЯ?

## Не столькі веды...

— Чаму вучыць, як вучыць і для чаго вучыць? — важнасць гэтых пытанняў у розныя часы ранжыравалася па-рознаму, — дзеліцца сваімі думкамі **настаўнік матэматыкі сярэдняй школы №1 горада Драгічына, член Асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў «Імкненне», член клуба «Крыштальны журавель» Алена ПРАТАСЕВІЧ.**— Быў час, калі настаўнік часцей за ўсё выступаў у ролі транслятара ведаў і аўтарытарна навязваў вучням той ці іншы пункт гледжання. Прыёмам навучання не надавалася асаблівае значэнне. Выпускнік школы павінен быць усебакова адукаваны, як універсальны салдат. Настаўнікі фармальна ўказвалі, што на ўроку павінны выхоўвацца, напрыклад, акуратнасць, уважлівасць і дысцыплінаванасць. На сённяшні дзень становіцца ўсё больш запатрабаванымі не столькі набытыя веды, колькі здольнасць аператыўна арыентавацца ва ўмовах імклівых змен, мабільнасць, крэатыўнасць і ў той жа час высокія маральныя якасці асобы.

Настаўніца канстатуе: «Усе мы выраслі на ідэалах таго часу, калі ўсе крыніцы інфармацыі, якія выкарыстоўваліся ў розным кантэксце, неслі адзін і той жа пасыл і мелі высокі выхаваўчы патэнцыял. Узорамі для пераймання для нас былі героі кніг, якія мы чыталі ў вялікай колькасці, персанажы выдатных фільмаў, якія шматразова праглядалі на канікулах. Сродкі масавай інфармацыі праходзілі жорсткую цэнзуру, і мы з іх дапамогай выхоўваліся ў рэчышчы ідэалогіі таго часу. Для сучаснай моладзі прыярытэтнай крыніцай інфармацыі з'яўляецца інтэрнэт. Прычым размова ідзе не пра дыстанцыйныя курсы ці вэбінары ў сеціве. Практычна ўвесь іх вольны час марнуецца на гульні. Проста для сябе кнігі не чытаюць увогуле. У выніку мінімальнай работы з тэкстам у дзяцей празмерна развітае «кліпавае» мысленне, у памяці прысутнічаюць толькі нейкія вобразы, апісаць якія ім не хапае ні моўнага запасу, ні выпрацаваных навыкаў. Між іншым, Беларусь плануе ў 2018 годзе ўдзельнічаць у даследаванні PISA, у цэнтры ўвагі якога будзе менавіта чытацкая пісьменнасць (разуменне пісьмовых тэкстаў)...

## «Сілкаванне» душы

На думку педагога, арганізацыя выхаваўчай работы ў школе на ўзроўні выключна пазакласных мерапрыемстваў сітуацыю кардынальна змяніць не можа. Вострая неабходнасць выкарыстання выхаваўчага рэсурсу кожнага вучэбнага занятку наспела ўжо даўно. «Класічнае пытанне «Як вучыць?» набыло крыху іншы сэнс — не як вучыць, каб ведалі больш, а як вучыць, каб уносіць уклад у развіццё і выхаванне? — падкрэслівае Алена Пратасевіч. — Любы творчы настаўнік стараецца дапоўніць змест падручнікаў дадатковымі матэрыяламі, якія забяспечваюць самы шырокі спектр магчымасцяў для рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу ўрока. Нават матэматыка, хоць яе і лічаць «сухой навукай», можа выхоўваць фабулай задач у самых розных кірунках».

Для вырабу 1000 м² паперы патрабуецца высечы лес з 1/4 га. З якой плошчы спатрэбілася высечы лес, каб выпусціць тыраж вашага падручніка матэматыкі? Якую плошчу лесу захаваў ваш клас у гэтым годзе, калі на 1 га ў сярэднім прыходзіцца 300 дрэў, а 100 кг макулатуры ратуе адно дрэва?

Аднымі з найбольш эфектыўных сучасных адукацыйных практык Алена Пратасевіч лічыць актыўную ацэнку і перакулены ўрок: «У рамках актыўнай ацэнкі вучні ўдзягваюцца ў пастаноўку мэт урока, ім зразумелыя крытэрыі поспеху, яны атрымліваюць каментарыі да вынікаў сваёй дзейнасці, рэкамендацыі, як іх палепшыць, і ўдзельнічаюць у рэфлексіўнай дзейнасці, якая прадугледжвае ўзаемаацэнку і самаацэнку, што, безумоўна, спрыяе выхаванню ўпэўненай на ўласных сілах творчай асобы, якая пастаянна імкнецца да самаўдасканалення», — падкрэслівае яна.



**«Супер», «Прафесійна», «Пазнавальна, актуальна, шматгранна», «Цікава, даступна», «Часцей бы такое», «Можна шмат даведацца і папоўніць сваю скарбонку», «Хацелася б, каб такія фестывалі праходзілі часцей, а не толькі перад Калядамі», «Я ўжо хачу на сёмы фестываль» — такія ўражанні пакідалі на імправізаванай ялінцы ўдзельнікі Рэспубліканскага каляднага фестывалю педагагічнага майстэрства.**

Сутнасць перакуленага ўрока заключаецца ў тым, што асноўныя вучэбныя дзеянні мяняюцца месцамі: з відэа- і тэарэтычным матэрыялам вучні знаёмяцца дома, а традыцыйнае дамашняе заданне выконваюць на наступны дзень у класе падчас сумеснага вывучэння і даследавання. Працэй кажучы, тое, што раней прызначалася для работы ў класе, засвойваецца ў дамашніх умовах, а тое, што было дамашняй работай, становіцца прадметам для разгляду ў класе. Такім чынам час урока выкарыстоўваецца не для азнаямлення з новым вучэбным матэрыялам, а для больш глыбокага разумення і аналізу. «Усё гэта, несумненна, спрыяе развіццю самастойнасці, арганізаванасці, мэтанакіраванасці і іншых валявых якасцяў», — лічыць педагог. А ўвогуле фарміраваць творчую асобу, здольную пераадольваць розныя цяжкасці, дапамагаюць усе эўрыстычныя метады навучання...

Асобнай увагі заслугоўваюць сітуацыі выхаваўчага характару, якія штучна ствараюцца настаўнікам на вучэбных занятках.

— Разглядаючы жураўлёў як аб'ект жывой прыроды ў рамках вывучэння біялогіі, можна паведаміць вучням, што ў міфалогіі многіх краін шэрыя жураўлі сімвалізуюць шлюбную вернасць, — прыводзіць прыклады Алена Пратасевіч. — Гэтыя птушкі ў пары моцна прывязаныя адна да адной, паўсюдна трымаюцца разам і захоўваюць вернасць зробленаму выбару на працягу ўсяго жыцця. Жуpавель, які страціў сваю спадарожніцу, ніколі не будзе шукаць іншую... Безумоўна, немагчыма пералічыць усе спосабы рэалізацыі выхаваўчага рэсурсу ўрока, паколькі творчы настаўнік здольны генерыраваць іх сам. Вельмі важна кожную порцыю ведаў абавязкова ўзбагачаць і эмацыянальна, і духоўна.

## Літаратура супраць медыя

Не сакрэт, што на настаўнікаў мовы і літаратуры традыцыйна ва ўяўленні многіх кладзецца ці не галоўны абавязак па выхаванні падрастаючага пакалення.

— Тры-чатыры ўрокі беларускай і рускай літаратуры на тыдзень супраць сучасных медыя. Рызыка таго, што выхаваннем нашых дзяцей будуць займацца тэлебачанне і інтэрнэт, — вельмі высокая, — дзеліцца сваімі думкамі **настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі №5 горада Віцебска, член Асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў «Імкненне» і клуба «Крыштальны журавель» Галіна СУХАВА.** — Сёння настаўнік літаратуры не можа звярнуцца да культурнай памяці вучня. Звыклыя пытанні традыцыйнай методыкі «Якія пачуцці выклікаў твор?», «Пра што верш?» — не працуюць. Вось вам прыклад. Верш Максіма Багдановіча «Замёрзла ноччу шпаркая крыніца...», які вывучаецца ў 8-м класе. «Пра што твор?» — цікаўлюся ў вучня. І чую ў адказ: "Пра ноч!"

Галіна Сухава ўпэўнена, што літаратурная і моўная адукацыя на сучасным этапе развіцця грамадства лепш за матэматычную фарміруе гнуткасць мыслення, уменне супярэжваць, пераўвчвацца і апрацоўваць новую інфармацыю. Пры гэтым яна заўважае: «Мастацтва само па сабе ёсць спакуса, і мяжа паміж дабром і злом у мастацкім тэксце бывае занадта тонкай. Так, беларуская літаратура прымушае задумвацца, але толькі настаўнік беларускай літаратуры можа матываваць вучняў да стваральнай дзейнасці».

Дарэчы, міжнародныя даследаванні самых розных узроўняў, у тым ліку PIRLS і PISA, сведчаць пра тое, што сучасныя дзеці чытаюць не толькі менш, але і значна горш, чым іх равеснікі 20—30 гадоў назад. Праблема заключаецца не ў хуткасці чытання, хоць і ў гэтым плане ўжо гучаць трывожныя сігналы. Галоўная праблема — у асэнсаванні і разуменні прачытанага, уменні ўсвядоміць і пачуць тое, што хацеў сказаць аўтар. Таму педагогаў ва ўсім свеце вельмі хвалююць пытанні фарміравання ў навучэнцаў чытацкай пісьменнасці...

## У сітуацыі маральнага выбару

— Я не даю на ўроках вучням гатовыя маральныя высновы, прымаю ўсе іх развагі, не крытыкую і не асуджаю, а пераконваю гісторыямі літаратурных герояў, — дзеліцца сваім бачаннем педагог. — Заахвочваю вучняў да пісьмовай і вуснай рэфлексіі над важнымі маральна-этычнымі праблемамі. На такіх уроках вядуцца палкія спрэчкі, натуральныя, без адрэпеціраванай драматургіі, — расказвае настаўніца. — Падводжу да думкі: вы хацелі б памяняць правілы гульні, але ў жыцці так не бывае. Нельга зрабіць адзін і той жа выбар, як немагчыма адмяніць наступствы раней прынятага рашэння, нельга дабіцца ўсяго адразу ці выкарыстаць адразу ўсе магчымасці. Мы не ведаем загадзя, з чаго прыйдзецца выбіраць у будучыні. Заўсёды будуць абмежаваныя час, сілы і выбар магчымасцяў. Такое «заглыбленне» ў сітуацыю маральнага выбару герояў спрыяе фарміраванню ў школьнікаў уласных жыццёвых перакананняў, а не фармальнаму засваенню маральных высноў. Дык у чым жа заключаецца выхаваўчы патэнцыял сучаснага ўрока літаратуры? На маю думку, у разуменні вучнем самога сябе, гісторыі і дзяржавы, любові і прыроды, шчасця і справядлівасці.

**Рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Андрэй МАНАСТЫРНЫ** таксама падзяліўся сваім бачаннем узнятых праблем.

— Выхаваўчы патэнцыял урока ў многім залежыць ад прафесіяналізму педагога: ці з'яўляецца той для дзіцяці аўтарытэтам, ці стварае на сваіх уроках умовы для развіцця і пакарэння новых вышынь? — падкрэсліў ён. Няважна, які прадмет выкладае настаўнік, галоўнае, якія ўмовы ён стварае на сваіх уроках для гарманічнага развіцця асобы. Эмацыянальны аповед, цікавыя задачы з мінулага, пытанні маральнасці ў навуцы, адказнасці навукоўцаў за ўласныя адкрыцці і іх наступствы дапамагаюць у выхаванні навучэнцаў. Упэўнены, што майстэрства настаўніка — не выпадковая ўдача і не шчаслівая знаходка, а сістэматычная карпатлівая праца, пастаянныя пошукі і спробы самаўдасканалення...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

WWW.ZVIAZDA.BY
WWW.ZVIAZDA.BY
WWW.ZVIAZDA.BY

## Зачапіла

Рэверс з сеціва

### С. КУРКАЧ. «Сябраваць з фінансамі з шасці гадоў»
*(«Звязда» ад 13 студзеня)*

— Вялікі дзякуй Белаграпрамбанку за гэты праект і цудоўную кнігу «Твае першыя фінансы». Мой сын таксама атрымаў яе і з задавальненнем чытае. Вельмі прыемна, што спецыялізаваныя веды аб фінансах прапануюцца дзецям менавіта на нашай мове.

Цалкам згодна з тым, што вучыцца лічыць грошы і планаваць свой уласны бюджэт малыя павінны ўжо з першых класаў. Гэта патрабаванне часу, але... Мне здаецца, што ўводзіць дадатковы ўрок у школьную праграму было б не зусім правільна. У вучняў нагрузка і так вельмі сур'ёзная. Спецыялісты з Нацбанка кажуць, што хутчэй за ўсё ў найбліжэйшы час рэальна разглядаць увядзенне пастаяннага «фінансавага» факультатыва. І тут існуюць нюансы. Справа ў тым, што сёння школу прымушаюць зарабляць грошы праз механізм платных дадатковых паслуг. Амаль упэўнена, што факультатыў па фінансавай адукаванасці мясцовыя школьныя кіраўнікі зробяць платным. Згадзіцеся, што нейк сумна атрымліваецца, калі за інфармацыю аб тым, як эканоміць уласныя сродкі, бацькі павінны будуць плаціць грошы. А вось бясплатны такі факультатыў, мне здаецца, усе будуць толькі вітаць.

**Марыя Аляксандраўна,** *Брэсцкая вобласць.*

### Н. НІКАЛАЕВА. «Кодэкс аб адукацыі: што зменіцца для навучэнцаў і бацькоў?»
*(«Звязда» ад 14 студзеня)*

— Упершыню пра неабходнасць унясення паправак у дзеючы Кодэкс «Аб адукацыі» загаварылі яшчэ ў 2013 годзе. І ўжо тады казалі, што жыццё настолькі імклівa змяняецца, што ўсяго праз два-тры гады, магчыма, зноў давядзецца штосьці карэктаваць. Дык навошта, скажыце, ствараць такі механізм, калі ўсе змяненні на перспектыву вымагаюць шматступеньчатага зацвярджэння? Трэба думаць, якія з прапаноў замацоўваць у кодэксе, а што можна прапісаць на ўзроўні іншых нарматыўных актаў, якія значна прасцей будзе адкарэктаваць.

Чатыры гады грамадскасць абмяркоўвае, ці трэба браць у дзясятыя класы ўсіх ахвотных. У нас абавязковая — дзевяцігадовая базавая адукацыя, а ў старшыя класы павінны прыходзіць толькі тыя вучні, якія не проста жадаюць, але і могуць засвойваць вучэбную праграму. А калі няма ні жадання навучацца, ні імкненняў, ні здольнасцяў? Будзем і надалей цягнуць усіх штучна да атрымання атэстата сталасці? Ці будзе гэта пытанне, нарэшце, адрэгуляванае ў кодэксе — невядома.

З чым яшчэ катэгарычна не магу пагадзіцца, дык гэта з пераўтварэннем школьнай суботы ў «дзень факультатываў». Фактычна мы вернемся да вучэбнага шасцідзённага тыдня. Афіцыйнае тлумачэнне «гэта зроблена для таго, каб зменшыць вучэбную нагрузку на працягу тыдня» гучыць наіўна... Давайце проста ў такім выпадку вернем шасцідзёнку з урокамі — гэта будзе больш эфектыўна.

А ці будзе вызначаны ў кодэксе мінімальны і максімальны нарматыў напаўняльнасці для груп падоўжанага дня? У сельскай мясцовасці, дзе дзеці залежаць ад школьных аўтобусаў, пытанне мінімальнай напаўняльнасці — прынцыповае! Адказаў мы пакуль не атрымалі...

**Галіна Мікалаеўна, педагог з 35-гадовым стажам,** *г. Мінск.*

### А. ДЗЯДЗЮЛЯ. «Сірочы хлеб»
*(«Звязда» ад 17 студзеня)*

— Фінансы трэба ўкладаць у развіццё, а не ва ўтрыманства. Падарункамі — такімі, як жыллё і грашовыя дапамогі, — не развіць самастойнасці і адказнасці. Хіба пра гэта не гаворыць тое, што многія сіроты не цэняць падораныя кватэры, ператвараюць іх у наркапрытоны. Жыллё для сірот — хутчэй кампенсацыя за няўдалае дзяцінства, а не інвестыцыя ў іх будучыню. Я прыехаў з правінцыі і, каб вырашыць жыллёвыя праблемы і замацавацца ў горадзе, сумяшчаў працу ў некалькіх месцах. Таксама пачынаў «з нуля», быў маладым, «зялёным»... Каб сапраўды дапамагчы сіротам, трэба забяспечыць іх нармальнай адукацыяй (магчыма, неабходны спецыяльныя класы для самых таленавітых ці падрыхтоўчыя аддзяленні для паступлення ў ВНУ). А таксама для іх варта стварыць працоўныя месцы. Добра, калі на прадпрыемствах будуць вучэбныя ўчасткі і за маладымі людзьмі замацоўць куратараў, якія дапамогуць разабрацца ў прафесіі і ўліцца ў калектыў.

**Віктар Воранаў,** *г. Брэст.*

### С. ЯСКЕВІЧ. «Нерэнтабельны падыход» *(«Звязда» ад 17 студзеня)*

— У свой час і я шукаў невыкарыстоўваемыя аб'екты пад сваё невялікае прадпрыемства ў прыгарадных з Брэстам раёнах. Дык вось у адным з іх, дзе такіх будынкаў процьма, у тым ліку базы былых вайсковых часцей, мне цану заламілі проста касмічную. У старшыні райвыканкама быў толькі адзін аргумент: «Калі я аддам танна, мяне пасадзяць».

Цікава атрымліваецца. Калі ўсё развaліцца, прыйдзе ў заняпад, — нікога не пасадзяць і не пакараюць. А калі, умоўна кажучы, прадпрымальнік падніме тое, што ўжо на зямлі валяецца, укладзе грошы, удыхне жыццё ў былыя развaліны — некага могуць пасадзіць? За што? Думаю, што ў барацьбе з карупцыяй мы яўна перагібаем палку, умоўна кажучы, не там шукаем ведзьмаў.

Я, дарэчы, тады казаў некаторым кіраўнікам раёна: «Калі вы так баіцеся турмы, можа, варта нам усім адседзець нейкі тэрмін добраахвотна наперад, а потым выйсці дружна на волю і спакойна працаваць на карысць людзям, сабе і краіне?»... Усё ж аднаго смялейшага я тады знайшоў, і будынак былога сацыяльнага аб'екта купіў па разумнай цане.

**Ігар М., прадпрымальнік,** *г. Брэст*

Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 2 (349)



■ Мабільнае кіно

# БЕЛАРУСКІ ФІЛЬМ ПЕРАМОГ У ФЕСТЫВАЛІ VELCOM SMARTFILM

**Конкурс мабільнага кіно ў гэтым годзе, шостым для Smartfilm'а, пашырыўся — стаў міжнародным і прапанаваў дасылаць работы любых жанраў.**



«Свабодны фармат» падтрымалі тысячай заявак, з якіх быў адабраны лонг-ліст з амаль 300 кароткаметражных работ (да дзесяці хвілін), знятых на мабільны тэлефон. Заяўкі прыходзілі з усяго свету — з Японіі, Індыі, Егіпта, ЗША, Нарвегіі , увогуле з 48 краін, але прыкладна трэцяя частка адабраных конкурсных работ усё роўна была беларускай. Гран-пры фестывалю атрымаў таксама беларус. На падвядзенні вынікаў конкурсу, што адбылося 19 студзеня, сталі вядомыя імёны пераможцаў, і галоўным з іх выбраны ўжо вядомы кінаэнтузіяст Кірыл Нонг.

Беларускаму гледачу гэты рэжысёр вядомы «вострасюжэтным баевіком» «Здымаць на паражэнне», які зняты ў 2012 годзе за дзве з паловай тысячы долараў. За аўтарам таксама лічыцца кароткаметражны фільм «Сінхранізацыя» — дыпломная работа для кінаакадэміі Лос-Анджэлеса. Гран-пры фестывалю velcom Smartfilm і адпаведна тры тысячы рублёў Кірыл Нонг атрымаў за карціну «Работнік года», героем якой з'яўляецца прыбіральшчык.

Апроч работы Нонга, у шорт-ліст фестывалю (12 карцін) трапілі яшчэ тры беларускія фільмы — «Памятаць» Кацярыны Нікановіч, «137 гадзін» Дзмітрыя Сахарука і «Умзарозум» Антона Байдзёнка. Апошняя з іх заняла ў выніку другое месца фестывалю velcom Smartfilm. Першае было аддадзена турэцкай карціне «Косць» Валкана Гюнея Экера, а трэцяе месца заняў французскі фільм «Да свету» Мір'яма Фантэна.

Шосты фестываль мабільнага кіно ацэньвала прафесійнае журы, у склад якога ўвайшлі праграмны дырэктар Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» Ігар Сукманаў, кінакрытык і культуролаг Максім Жбанкоў, кінакрытык Антон Сідарэнка, малады рэжысёр Мітрый Сямёнаў-Алейнікаў (у Беларусі прагучала яго кароткаметражка «Адной крыві»). Пятага члена журы выбіралі ў свой час праз пэўны конкурс, у якім далі магчымасць паўдзельнічаць усім ахвотным, і выбралі студэнтку Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Аляксандру Сергеевіч.

Фестываль мабільнага кіно velcom Smartfilm арганічна ўплятаецца ў сучасны этап развіцця кінематографа, калі смартфон як самая простая непрафесійная прылада становіцца інструментам для стварэння таленавітых фільмаў, пэўнай прыступкай аўтараў да вялікага кіно, праверкай рэжысёраў на трываласць. Фармат кароткага метра зусім не значыць спрошчанасць задачы, а наадварот патрабуе асаблівага падыходу да драматургіі і рытму, вытрымаць які можа не кожны прагны да стварэння кіно аматар.

Фестываль velcom Smartfilm не абмяжоўваецца толькі конкурсам мабільнага кіно, а праводзіць таксама майстар-класы (кінакрытыка Антона Доліна, сцэнарыста і рэжысёра Арсенія Ганчукова, прадзюсара Івана Капітонава). Сюды ж уваходзіць «дэбютны» выпуск так званага кінамарафона Cinema Weekend, у які ўвайшлі майстар-класы, кінапаказы і кінавіктарыны.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Вернісаж

# «Час — ваша мастацтва. Мастацтва — ваша свабода»

## Рэпрадукцыі Густава Клімта выстаўляюцца ў Мінску

**Яны ўзбунтаваліся, запратэставалі і паўсталі супраць традыцыйнага жывапісу, эклектыкі, класічнага стылю і паставілі свае ўмовы — спрэчныя, гучныя і нават скандальныя. У канцы XIX стагоддзя па Еўропе разлілося «новае бачанне» — пра сябе заявілі тыя, хто хацеў пісаць інакш, адсунуцца ад кансерватызму, прапанаваць нешта невядомае. Мадэрн стаў часткай гісторыі многіх жывапісных школ, жывапісу наогул, мастацтва ў цэлым і нават сусветнай гісторыі. Як яго толькі не называлі — ар-нуво, ціфані, югендстыль, або Венскі сецэсіён. Менавіта да апошняга прамое дачыненне мае, мабыць, найвядомейшы аўстрыйскі мастак і адзін з самых дарагіх жывапісцаў свету Густаў Клімт. Цяпер у Мінску выстаўляюцца рэпрадукцыі яго работ, выкананыя ў тым ліку з выкарыстаннем сусальнага золата. Пляцоўкай для экспазіцыі стаў гандлёва-забаўляльны цэнтр Galleria Minsk.**

Эратызм, пазалота, «Пацалунак», арнаменталізм, нянавісць феміністак, меркаваныя сорак пазашлюбных дзяцей — тое, што прыходзіць у галаву ў сувязі з імем Клімта. Агаленыя жаночыя фігуры і жанчына наогул былі цэнтральнай тэмай мастака, якую ён выкарыстоўваў нават пры буйным заказе на тры карціны для будынка Венскага ўніверсітэта. «Філасофія», «Медыцына» і «Юрыспрудэнцыя» ўвасобіліся ў жаночых вобразах, што цвердалобы прафесарскі склад сустрэў з непаразуменнем і папрасіў Міністэрства культуры адмяніць заказ. Відавочна, гэта было памылкай з іх боку. Феміністкі рух таксама коса глядзіць на творчасць Клімта і сцвярджае, быццам мастак паказвае жанчыну як прадмет жадання, а не асобу. Хоць насамрэч глянь на палотны аўстрыйца — а жанчына тут велічна пакурвае на п'едэстале (не ў прамым сэнсе, вядома). Дыхаць холадам у бок мадэрніста павінны якраз мужчыны, таму што яны калі і прысутнічаюць, то са схаваным тварам. Тым не менш гэта абмеркаванне пацвярджае пэўную эпатажнасць клімтаўскай творчасці і яго персоны, як і «сорак пазашлюбных дзяцей», якія могуць аказацца толькі экстравагантнай здагадкай біёграфаў аўтара, які ніколі не быў жанаты і, дарэчы, вёў просты лад жыцця.

**Вядомае палатно Клімта «Партрэт Адэлі Блох-Баўэр I» у 2006 годзе было набыта за 135 мільёнаў долараў і на кароткі перыяд узначаліла спіс самых дарагіх карцін свету.**

Дык вось, у 1897 годзе Густаў Клімт і яшчэ сорак мастакоў кінулі выклік традыцыям у мастацтве, выказалі ім сваё цвёрдае «фі» і стварылі Венскі сецэсіён. Аб'яднанне атрымала свой выставачны будынак (над галоўным уваходам красаваўся надпіс «Час — ваша мастацтва. Мастацтва — ваша свабода»), стала прывозіць венцам замежных аўтараў і рэгулярна прапаноўваць публіцы ўласныя экспазіцыі. Клімт, які ўзначаліў аб'яднанне, да гэтага часу ўжо быў скандальна вядомым аўтарам, хоць бы дзякуючы тром навукам, увасобленым у жаночых вобразах.



Сын мастака, ювеліра і гравёра па золаце (адсюль золата ў вобразах, на карцінах і ў назве творчага перыяду), ён з сям'ёй жыў досыць бедна (не галота, проста непастаянны заробак). І стаў адным з самых вядомых мастакоў, адным з самых цытаваных у паўсядзённасці і масавай культуры (рэпрадукцыі яго карцін, выкарыстоўвае брэнд IKEA, таксама мода, архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і іншае) і адным з самых дарагіх аўтараў. Напрыклад, вядомае палатно Клімта «Партрэт Адэлі Блох-Баўэр I» у 2006 годзе было набыта за 135 мільёнаў долараў і на кароткі перыяд узначаліла спіс самых дарагіх карцін свету. (Сёння самым дарагім палатном лічыцца «Калі вяселле?» Поля Гагена, набытае ўладамі Катара прыкладна за 300 мільёнаў долараў.)

Чалавек, нават кепска знаёмы з аўстрыйскім жывапісам, хутчэй за ўсё ведае Густава Клімта па карціне «Пацалунак». «Залатая» пара ў абдымках на квітнеючай паляне, якая абрываецца ля ног жанчыны. Тут, дарэчы, дэманструецца манера мастака адлюстроўваць мужчын, пра якую гаварылася вышэй, і, акрамя гэтага, арнаментальнасць, насычанасць, пазалота, сімвалічнасць і супярэчлівасць пачуццяў — карціну мастак паказаў на выставе ўжо Саюза аўстрыйскіх мастакоў, які ён заснаваў з сябрамі пасля выхаду з сецэсіёна.

**Феміністкі рух таксама коса глядзіць на творчасць Клімта і сцвярджае, быццам мастак паказвае жанчыну як прадмет жадання, а не асобу.**

Рэальны «Пацалунак» можна ўбачыць у Венскім музеі, у Мінск жа ён прыехаў, вядома, не з музейнай залы, а ў рамках сусветнага турнэ выставы рэпрадукцый «Густаў Клімт. 100 гадоў без генія». Магчыма, патрабавальныя і ўспрымальныя культуролагі не ўхваляць такую практыку, але той, хто не хутка трапіць у Вену, можа наведаць Клімта ў беларускай сталіцы да 15 лютага.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Фестываль

# ПАТРАПІЛІ НА «НЯБЁСЫ»

**Абвясцілі вынікі III Міжнароднага каляднага фестывалю батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы»**

**Фестываль заўсёды ладзіцца ў святочныя дні. Такое рашэнне вельмі арганічнае: калі ж яшчэ паказваць спектаклі пра нараджэнне Сына Божага, як не на Каляды, на стары Новы год? Можна казаць, што арганізатары «Нябёсаў» аднаўляюць народныя традыцыі, але са сваімі асаблівасцямі: калі раней батлейшчыкі вандравалі з вёскі ў вёску і самі прыязджалі да гледачоў, то зараз зацікаўленая аўдыторыя збіраецца ў будынку нядзельнай школы Свята-Елісавецінскага манастыра.**

Цяжка паверыць, што тры гады таму на фестываль «Нябёсы» сабралася толькі адзінаццаць калектываў. Першы фэст быў аматарскі: ён працягваўся ўсяго два дні і быў арганізаваны за некалькі тыдняў. Але прайшоў так паспяхова, што на наступны год да каманды далучыліся арганізатары-прафесіяналы, якія прапанавалі зрабіць «Нябёсы» міжнародный падзеяй. Запрасілі калектывы з-за мяжы, і ў 2016 годзе на чатыры дні ў Мінску сустрэліся 19 тэатраў. Сёлета ўдзельнікаў крыху больш: у нядзельнай школе перад гледачамі прайшло 20 спектакляў. Дзевяць тэатраў прыехалі ў Беларусь ад міжнароднай асацыяцыі «Вандроўныя лялечнікі». Акрамя чатырох фестывальных дзён, напярэдадні афіцыйнага адкрыцця праходзіла школа батлейкі. Кіраўнікі аматарскіх калектываў з усёй краіны з'ехаліся на семінар і майстар-класы, падчас якіх пра нюансы батлеечнага мастацтва расказалі беларускі этнограф, майстар музычных інструментаў Алесь Лось і кіраўнік маскоўскага тэатра «Вандроўны вяртэп» Аляксандр Грэф.

Узровень III каляднага фестывалю ўзрос: з'явілася прафесійнае журы з педагогаў ды тэатразнаўцаў, працягвае расці майстэрства канкурсантаў. Але і цяпер на фэст прыязджаюць сямейныя непрафесійныя тэатры, пераважна — вернікі. Для энтузіястаў гэта вельмі карысная практыка: паляпшаецца разуменне справы, фарміруецца густ, назапашваюцца веды. Тым больш што арганізатары «Нябёсаў» падтрымліваюць ініцыятыву: без узнагарод і спецыяльных дыпломаў амаль ніхога не адпускаюць.

Сёлета ўладальнікам Гран-пры і дыплома «За лепшы спектакль» стаў маскоўскі тэатр «Душагрэі». Расіяне прывезлі ў Мінск вельмі насычаную і аўтэнтычную праграму, у якой, акрамя класічнага вертэпу, былі «жывое» тэатральнае выступленне перад гледачамі і інтэрактыў для дзяцей (руская народныя гульні са спевамі). Другі дыплом «За лепшы спектакль» атрымаў польскі тэатр-студыя «БЛЮМ», дзе артысты замест звычайных лялек выкарыстоўвалі паленне, а трэці дыплом «За лепшы спектакль і наватарскае рашэнне традыцыйнай тэмы» адышоў да Малога тэатра марыянетак (г. Харкаў, Украіна) за спектакль «Батлейка».

— Галоўная мэта фестывалю, заключаная ў нашым дэвізе, — «З лялькай да Бога». Праз батлейку людзі розных прафесій, з розных краін, на розных мовах паказваюць свае таленты і такім чынам служаць Богу ў гэтыя святочныя дні, — патлумачыў мастацкі кіраўнік і вядучы фестывалю, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Аляксандр Ждановіч. — Гледачы, што прыходзяць на «Нябёсы», дакранаюцца да светлага і чыстага, нават дзіцячага — бо звязана яно з нараджэннем Боскага Немаўляці — свята Раства Хрыстова. Напярэдадні я стаў сведкам цікавай гісторыі: дзецям сказалі, што нябёсы знаходзяцца не ўверсе, а ўнутры чалавека, і пасля спыталі, як яны разумеюць гэтую фразу. Адзін хлопчык адказаў так, як, на мой погляд, не прыдумаў бы ні адзін мудрэц! Ён патлумачыў: «Гэта значыць — стаць нябёсамі для іншага». Напэўна, да гэтага нас і заклікае царква: не толькі браць, але і аддаваць. Такую атмасферу дабрыні імкнецца стварыць фестываль «Нябёсы».

Арганізатары фестывалю сапраўды займаюцца не толькі імпрэзай, але і дабрачыннай праграмай. Па традыцыі ўдзельнікі «Нябёсаў» — беларусы, расіяне, украінцы, палякі — прыязджалі ў дзіцячыя дамы, прытулкі, бальніцы са сваімі скрынямі, каб паказаць спектаклі тым, хто мае найвялікшую патрэбу ў калядных цудах.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

■ Пачытаем!

# КУПАЛА — «ГОТ», КОЛАС — КОМІК?

## Белліт, якому нас не вучылі ў школе

**Серыя «Мая беларуская кніга», якая выходзіць у выдавецтве «Папуры» з 2015 года, папоўнілася новымі асобнікамі. Серыя мае трывалую папулярнасць сярод чытачоў, перш за ўсё таму, што дае ўнікальную магчымасць паглядзець на нацыянальных класікаў не праз прызму школьнай літаратуры — знізу ўверх, а так, як глядзелі б мы на сучаснікаў — твар у твар. У серыі сапраўды сабрана самае лепшае — актуальнае, пазачасавае, вечнае.**

СПРОБЫ па-новаму пабачыць беларускіх пісьменнікаў, актуалізаваць іх творчасць — сёння з'ява досыць распаўсюджаная. Вось нядаўна пісьменнік Ігар Палякоў задаў пытанне: «Хто быў першым майстрам стэнд-апу на Беларусі?» I сам жа на яго адказаў: «Якуб Колас. Калі ён вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, то выступаў на мясцовых пляцоўках з кароткімі смешнымі апавяданнямі». Сапраўды, Якуб Колас — заўсёды быў майстрам кароткага апавядання. Яго найлепшыя творы вылучаюцца лаканічнасцю, выразным сюжэтам і, безумоўна, гумарам, уменнем паглядзець абсалютна на любую з'яву са смешнага боку.



Разам з тым, мы ведаем Коласа не толькі як чалавека, які ўмеў падкрэсліць камічныя моманты жыцця, але і як пісьменніка, схільнага глядзець на жыццё рэалістычна, са скепсісам, іроніяй, дзе-калі песімізмам. Вось гэтая ўзважанасць — камічнага і трагічнага, аптымістычнага і песімістычнага — і ёсць прыкмета сапраўднага філасофскага светагляду. Разгарніце коласаўскія «Казкі жыцця»...

«Лепш быць нешчаслівым, але відушчым, чымсі шчаслівым, але сляпым». («Чыя праўда?») Слепатой, дарэчы, Колас называе тут няведанне спрадвечных законаў жыцця...

Ці вось іншая казка... «Стары лес»: «На свеце часта бывае так, што самая простая справа, самая ясная праўда пазнаецца цаной вялікай пакуты — надта цяжкая дарога прыводзіць да пазнання...»

А ў казцы «Што лепей?» Колас разважае: «Хто ведае, можа, гэты сум, гэтая туга — адвечныя спадарожнікі тых, хто многа разважае, хто жыве адзін з сабой, а можа, і праўда — такое ўсё жыццё, што не дае задавальнення...»

Чытаючы развагі Коласа-філосафа, разумееш, што такія казкі не пішуцца для дзяцей... Тады для каго? Для падлеткаў, каб папярэдзіць іх, што жыццёвая гармонія трымаецца не толькі на суцэльнай радасці. Для людзей сталага веку — каб разумелі, што калаварот жыцця рухаецца з непазбежнай наканаванасцю. Нараджэнне, росквіт, сталасць, смерць, новае жыццё... Свет жыве ў бясконцым паўторы!

ВЯСЁЛАЕ і сумнае, святло і змрок... Гэтыя супярэчнасці паўтараюцца не толькі ў жыцці, але і ў адным чалавеку.... Больш таго, існуе такое паняцце, як эмацыйныя арэлі. Як вядома, арэлі з аднолькавай амплітудай разгойдваюцца ў два бакі. Так і чалавечы настрой разгойдваецца — колькі ў нас светлага, вясёлага, сонечнага, столькі і сумнага, змрочнага, дэпрэсіўнага. Часта можна пачуць пра самагубцаў, якія пайшлі з жыцця пры загадкавых абставінах, што вось, маўляў, не верыцца, што чалавек зрабіў гэта добраахвотна, — ён жа так любіў жыццё! Але здатнасць да моцных пачуццяў не мае знаку — натура тонкая, датклівая ўсё ўспрымае аднолькава ярка, востра, глыбока!

Гэта добра разумееш, калі чытаеш вершы Янкі Купалы. Старонка за старонкай, верш за вершам... I паўстае перад чытачом не толькі творца, але і асоба — ранімая, схільная пераважна змрочны бок жыцця, не даваць веры ні сабе, ні людзям. Каб юнацтва Купалы прыпала на канец дваццатага стагоддзя, то з яго атрымаўся б класічны «гот», схільны да негатыўнага ўспрымання свету, рамантыка-дэпрэсіўнага погляду на жыццё. Мала хто дадумваецца ў дваццаць чатыры гады напісаць, як Купала, уласную эпітафію: «Тут ляжыць Янук Купала, // Што песні складаў, // Плакаў шмат, смяяўся мала, // Часта галадаў... // Без зямлі ўвесь век цягаўся // Горш якой скаціны, // Вось нарэшце дачакаўся — // Далі тры аршыны. // Надпіс гэты хто прымеце, // Хай Бога папросе, // Каб яму хоць на тым свеце // Лепш, як тут, жылося».



Замкнёнасць, меланхолія, мізантропія — тое, што вылучае творы Янкі Купалы на працягу ўсяго жыцця. У вершы «З людзьмі» паэт скардзіцца: «Трудна, крыўдна жыць на свеце // Між нячулымі людзьмі, // Не раз вочы маладыя // Заліваюца слязьмі», а ў «Разладзе» ўдакладняе: «Куды ні глянеш — людзі, людзі, // Куды ні глянеш — шэльмы, шэльмы...» Праблемы ў стасунках з грамадствам (непрыманне стэрэатыпаў, стандартаў паводзін), вытанчанае пачуццё прыгожага, прыхільнасць да звышнатуральнага — ну чым не прадстаўнік гатычнай субкультуры, дзе адной з характэрных рыс з'яўляецца асаблівае, паўрамантычнае ўспрыманне смерці? «У гэткай хвілі цяжкай, труднай // Нямілым робіцца жыццё, // Прагкляў бы свет, і быт, і долю, // Усё б на лес сухі паслаў, // I даў бы думам спаць уволю // I сам бы спаў, навекі спаў».

МЫ прывыклі думаць пра беларускіх класікаў, як пра «паноў сахі і касы», але ж насамрэч у жыцці ім былі ўласцівыя і арыстакратызм, і тонкасць адчуванняў, і глыбокі псіхалагізм.



Менавіта псіхалагізмам, уменнем разбірацца ў чалавечых паводзінах, верай у сілу дабрыні і моц кахання вылучалася, напрыклад, проза Элізы Ажэшкі, чый раман «Хам» — гімн сапраўдным пачуццям. Пісьменніца верыць у каханне, якое жыве насуперак учынкам, абставінам і нават логіцы: «Ёсць на свеце чалавечая натуры, глыбейшыя за любы калодзеж, і калі аднойчы ўпадзе ў іх кветка кахання, дык ніякія бурныя хвалі не выкінуць яе назад, ніякая крыўда не прымусіць чалавека абразіць гэта каханне скаргай, выказанай уголас...»

Ажэшка пісала свае творы па-польску, але ўсё жыццё пражыла на Беларусі. У свой час яна была вельмі папулярнай, прычым настолькі, што магла стаць першым беларускім набеліятам!

Як вядома, у 1904 годзе па прапанове прафесара Берлінскага ўніверсітэта Ажэшка была намінавана на Нобелеўскую прэмію. Члены Нобелеўскага камітэта высока ацанілі яе пісьменніцкі талент. У адным з дакументаў камітэта напісана: «Наколькі ў тэкстах Сянкевіча б'ецца шляхетнае польскае сэрца, настолькі ў творчасці Элізы Ажэшкі б'ецца сэрца чалавека». Але большасць членаў камітэта прагаласавала за Генрыка Сянкевіча, а некаторыя прапанавалі падзяліць прэмію. Пазней, у 1909 годзе Ажэшку зноў намінавалі на Нобелеўскую прэмію, але гэтым разам узнагарода дасталася шведцы Сельме Лагерлёф.

...У кожнага з нас са школьнай лаўкі склаўся свой вобраз роднай літаратуры. Не заўсёды ён прыязны, станоўчы, але ніколі не позна яго змяніць, пазнаёміцца з творамі класікаў не пад пільным настаўніцкім поглядам, а самастойна, выбіраючы творы сабе па гусце і настроі.

Ганна КІСЛІЦЫНА

■ На сцэне

# У РУСКІМ ТЭАТРЫ — КАМЕДЫЯ «КАРЧМАРКА»

**Італьянскі рэжысёр вярнуўся ў Мінск дзеля работы над ужо другім спектаклем**

**Яшчэ ў 2014 годзе Матэа Сп'яцы паставіў у драматычным тэатры імя Горкага камедыю традыцыйнага для Італіі жанру дэль артэ. Гэта пастаноўка — яна называецца «Viva commedia!» — па творы таксама італьянскага драматурга Рыкарда Піпа ідзе на сцэне Рускага тэатра і сёння — з традыцыйнымі для яе персанажамі, з адпаведнымі дэкарацыямі, з жартамі, воклічамі, знарочыстасцю. А ўжо ў 2017-м з тэатра прыляцела навіна, што тут рыхтуецца прэм'ера: Матэа Сп'яцы паставіць у Рускім ужо другі свой спектакль — тут не будзе Панталоне, Каламбіны і дурнога слугі Дзані, але гэта будзе таксама камедыяй: рэжысёр узяўся за п'есу Карла Гальдоні «Карчмарка».**

Усё пачалося ў год, калі Італія старшынствавала ў Еўрасаюзе, у сувязі з чым праводзіла сваю культурную праграму. Матэа Сп'яцы і Рыкарда Піпа ладзілі тады майстар-класы для беларускіх артыстаў у Мінску, і было вырашана — чаму б і не пасупрацоўнічаць з беларускім тэатрам. Невядома, чаго каштавала італьянскаму рэжысёру стварыць той італа-беларускі мікс — італьянскі тэатр з яго спрадвечным персанажам Дзані на нашай пляцоўцы, з айчыннымі акцёрамі і нават жартамі, актуальнымі і зразумелымі толькі тут, але «Viva commedia!» атрымала сваю долю папулярнасці.

Прайшоў час, і старшынства ў Еўрасаюзе ўжо за Мальтай, а супрацоўніцтва італьянскага рэжысёра і Мінскага драматычнага тэатра імя Горкага (у Італіі рэпертуарны тэатр — рэдкая з'ява), што пачалося дзякуючы той культурнай праграме, захавалася. Матэа Сп'яцы рыхтуе папаўненне рэпертуару п'есай Гальдоні, у цэнтры якой маладая і кемлівая Мірандаліна, што ўтрымлівае гасцініцу ў Фларэнцыі. Трохактовую «Карчмарку», кажуць, Сп'яцы значна перапрацаваў: дадаў персанажаў і сюжэтных паваротаў. Галоўную ролю ў спектаклі выканае Вераніка Пляшкевіч, апроч яе ў пастаноўцы задзейнічаны заслужаны артыст Беларусі Сяргей Чэкерэс, Аляксандр Вергуноў, Алена Дуброўская, Уладзімір Глотаў, Іна Савянкова, Андрэй Крывецкі — у асноўным акцёры, што супрацоўнічалі з Матэа Сп'яцы і мінулы раз.

Зараз рэжысёр вядзе рэпетыцыі, прэм'ера класічнай італьянскай камедыі «Карчмарка», сюжэт якой стаў асновай некалькіх опер і неадназова экранізаваўся ў кіно, адбудзецца на сцэне Рускага тэатра 18 і 19 лютага.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

*katsyalovich@zviazda.by*

# РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже автомобиля, принадлежащего РУП «ЦЕНТРКУРОРТ» на праве хозяйственного ведения

| № Лота | Описание | Местонахождение | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | VOLKSWAGEN CRAFTER, грузовой фургон, г.в. 2008, двигатель – дизельный, с рабочим объемом 2 500 см³, МКПП, кузов (рама) №WV1ZZZ2EZ86028566, цвет белый, диски штампованные. | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 54/35 | 9 085,20 | 500,00 |

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо – в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта не позднее 10 (десяти) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость, приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) банковских дней с даты заключения договора купли-продажи Объекта.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Передача Объекта производится только после полной оплаты не позднее 30 (тридцати) календарных дней с даты оплаты.
Сумма внесенного Победителем аукциона (Претендентом на покупку) задатка учитывается при оплате Объекта.
При оплате наличными денежными средствами Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Продавцу расходы, связанные с инкассацией наличных денежных средств.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан дополнительно оплатить остатки топлива в бензобаке транспортного средства (по отдельной стоимости).
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь и настоящим договором для Победителя аукциона

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 1 000,00 белорусских рублей

**Аукцион состоится 15.02.2017 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец РУП «ЦЕНТРКУРОРТ», тел. +375-17-222-63-96.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже автомобиля, принадлежащего РУП «ЦЕНТРКУРОРТ», проводимом 15 февраля 2017 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений 13.02.2017 в 10.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Севрук Олег Николаевич, тел. 8 (029) 108-06-69.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Объявление о проведении торгов по продаже недвижимого имущества

# ОАО «Ветковская хлопкопрядильная фабрика»

Управляющий объявляет о проведении последних торгов по продаже имущества. Торги проводятся в форме открытого аукциона. **Торги состоятся 7 февраля 2017 в 11-00 час. по адресу: Гомельская область г. Ветка, ул. Батракова, 38.**

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота) | Начальная цена продажи, руб. (цена с учетом НДС) | Задаток, руб. | Шаг аукциона, % | Затраты на подготовку документации |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 50 | Станок токарно-винторезный 1 А616 инв. №336 | 2 121,60 | 212,16 | 5 | **170,42** |
| Лот № 52 | Станок зубофрезерный мод. 5К-8/10 инв. №330 | 3 638,40 | 363,84 | 5 | **170,42** |
| Лот № 53 | Станок механический ножовочный инв. №338 | 4 550,40 | 455,04 | 5 | **170,42** |
| Лот № 58 | Котел КСБ-95 инв. №7452 | 2 054,40 | 205,44 | 5 | **170,42** |
| Лот № 61 | Автомобиль Фольксваген Пассат №1063 АН-3 | 6 631,20 | 663,12 | 5 | **192,26** |
| Лот № 62 | Автомобиль Фольксваген Бора №1626 АМ-3 | 4 017,60 | 401,76 | 5 | **192,26** |

Имущество расположено по адресу:
Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38.
Для участия в торгах необходимо:
1. Оплатить задаток в размере, указанном в объявлении, от начальной цены лота на р/с 3012210290015 в РКЦ №8 филиала ОАО «Белагропромбанк», Гомельское областное управление г. Ветка, ул. Чапаева, 6, МФО 151501912, УНН 400052674.
2. **По 3 февраля 2017 года** включительно в рабочие дни с 9.00 до 15.00 подать заявление на участие в торгах и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: Гомельская обл., г. Ветка, ул. Батракова, 38.
К заявлению прилагаются следующие документы:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);
индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельство о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо предоставляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельство о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организации; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документы о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организации без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.
При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.
Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов.
Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона, заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола.
Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола.
Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Порядок проведения торгов, условия, оформление участия в торгах определяются согласно Плану ликвидации ОАО «Ветковская хлопкопрядильная фабрика», ознакомиться с которым можно в дни приема заявок на участие в торгах. С дополнительной информацией о торгах можно ознакомиться по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38, тел.: 8(02330) 2-11-06, 2-12-03.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества | Лот №1.<br>1\2 доля в праве собственности на изолированное помещение квартира с инвентарным номером 200/D-48666 площадь 44,9 кв. м (комната в 2-комнатной квартире).<br>Начальная стоимость лота – 14 000,00 рубля |
| Собственник (владелец) имущества | Яскевич Сергей Александрович |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Витебск, ул. Герцена, 17-24 |
| Наличие обременений | Не имеется |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения Витебского района, г. Витебск, ул. Кирова, 7/13<br>03 февраля 2017 года в 10.00 |
| Справочная информация | Организатор торгов: ГУЮ Витоблисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, д.10, к. 1<br>www.vitebskjust.gov.by<br>Судебный исполнитель Гребенчук Павел Владимирович,<br>тел. (80212) 647138, 375 33 399-65-38 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Витебского района г. Витебска: филиал №200 «АСБ Беларусбанк», код банка 150801635, р/с 3642903002661, УНП 300002505, не позднее 31 января 2016 года.<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с частью 6 статьи 516 Гражданского процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |

# БПС-СБЕРБАНК

## Уважаемые клиенты!

С **23.01.2017** ОАО «БПС-Сбербанк»:
1. Устанавливает следующий размер процентов **по действующим** договорам в белорусских рублях:

1.1. Заключенным до 01.04.2016 срочного банковского депозита «Доверяй+»:

| Размер процентов (годовых) |
|---|
| 9 |

1.2. Заключенным с 01.04.2016 до 16.01.2017 срочного отзывного банковского депозита «Доверяй»:

| Размер процентов (годовых) |
|---|
| 9 |

1.3. Заключенным с 01.04.2016 до 01.08.2016 срочного отзывного банковского депозита «Сохраняй»:

| Сумма депозита | Размер процентов (годовых) по срокам привлечения для депозитов **в белорусских рублях** | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 90-189 дней | 190-369 дней | 370-500 дней | 501-750 дней | 751-1000 дней |
| от 50 – до 500 BYN | 12,5 | 13,5 | 14,5 | 15,5 | 16,5 |
| от 500 – до 2 500 BYN | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| от 2 500 – до 10 000 BYN | 13,5 | 14,5 | 15,5 | 16,5 | 17,5 |
| от 10 000 BYN | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |

1.4. заключенным с 01.08.2016 до 26.12.2016 срочного отзывного банковского депозита «Сохраняй»:

| Сумма депозита | Размер процентов (годовых) по срокам привлечения для депозитов **в белорусских рублях** | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 90-189 дней | 190-369 дней | 370-500 дней | 501-750 дней | 751-1000 дней |
| от 50 – до 500 BYN | 11 | 12 | 13,5 | | |
| от 500 – до 2 500 BYN | 11,5 | 12,5 | 14 | | |
| от 2 500 – до 10 000 BYN | 12 | 13 | 14,5 | | |
| от 10 000 BYN | 12,5 | 13,5 | 15 | | |

1.5. заключенным с 01.04.2016 до 01.08.2016 срочного безотзывного банковского депозита «Сохраняй»:

| Сумма депозита | Размер процентов (годовых) по срокам привлечения для депозитов **в белорусских рублях** | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 90-189 дней | 190-369 дней | 370-500 дней | 501-750 дней | 751-1000 дней |
| от 50 – до 500 BYN | 15,5 | 16,5 | 19 | | |
| от 500 – до 2 500 BYN | 16 | 17 | 20 | | |
| от 2 500 – до 10 000 BYN | 16,5 | 17,5 | 21 | | |
| от 10 000 BYN | 17 | 18 | 21 | | |

1.6. заключенным с 01.08.2016 до 26.12.2016 срочного безотзывного банковского депозита «Сохраняй»:

| Сумма депозита | Размер процентов (годовых) по депозитам **в белорусских рублях** | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 90-189 дней | 190-369 дней | 370-500 дней | 501-750 дней | 751-1000 дней |
| от 50 – до 500 BYN | 13 | 14,5 | 16 | | |
| от 500 – до 2 500 BYN | 13,5 | 15 | 16,5 | | |
| от 2 500 – до 10 000 BYN | 14 | 15,5 | 17 | | |
| от 10 000 BYN | 14,5 | 16 | 17,5 | | |

Установленный подпунктами 1.1.-1.6. размер процентов будет применен к депозитам **с 23.02.2017.**

2. Прекращает прием дополнительных взносов в белорусских рублях по заключенным до 26.12.2016 договорам срочного безотзывного банковского депозита «Сохраняй» (Условия от 23.03.2016 № 01/01-07/166) и по заключенным до 01.04.2016 договорам срочного банковского депозита «Доверяй+» (Условия от 01.10.2014 № 01/-07/340).

3. Разрешает при обращении вкладчиков о досрочном востребовании срочного безотзывного банковского депозита «Сохраняй» в белорусских рублях, открытого до 26.12.2016, закрывать указанные депозиты под основную процентную ставку (без пересчета процентов).

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года
на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

# РЕСПУБЛИКАНСКОЕ УНИТАРНОЕ ДНЕПРО-ДВИНСКОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ ВОДНЫХ ПУТЕЙ «БЕЛВОДПУТЬ»

**извещает о проведении повторного аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - помещение площадью 46,83 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Коммунаров, 7.<br>Размер арендной платы в месяц составит 400,00 руб. без учета коммунальных услуг, расходов на содержание здания и причитающихся налогов. Договор аренды заключается сроком на 3 (три) года. Цель использования: для размещения цветочного магазина без предоставления арендатору права на их выкуп.<br>- помещения площадью 54,2 кв. м (5,99+17,49+30,72), расположенные по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Коммунаров, 7.<br>Размер арендной платы в месяц составит 650,00 руб. без учета коммунальных услуг, расходов на содержание здания и причитающихся налогов. Договор аренды заключается сроком на 3 (три) года. Цель использования: для размещения офиса без предоставления арендатору права на их выкуп.<br>Здание конца XIX – начала XX века, включено в Перечень материальных объектов, которым придается статус и категория историко-культурных ценностей Республики Беларусь | 343,50 | 34,35 |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления на аукцион** | **По 30 января 2017 г**. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 16⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Коммунаров, 7, каб. 6 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **01 февраля 2017 г. в 11-00** по адресу: г. Гомель, ул. Коммунаров, 7 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012111895016 в РД №300 ОАО«БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 400011137<br>Получатель платежа: ГП «Белводпуть».<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 14.12.2016 г. |
| **Условия продажи** | Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 15%.<br>Подписание проекта договора аренды и подготовка документов для согласования с Министерством транспорта и коммуникаций РБ в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона, с участником, ставшим победителем аукциона. Подписание акта приема-передачи арендуемого имущества в течение 10 (десяти) рабочих дней после получения согласия от Министерства транспорта и коммуникаций РБ.<br>Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

Для участия в аукционе необходимо:
Оплатить задаток на расчетный счет Организатора аукциона ( ГП «Белводпуть» ) р/с 3012111895016 в РД №300 ОАО«БПС- Сбербанк», БИК 153001369, УНП 400011137 **по 30 января 2017 года** в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и с 14-00 до 16-00.
Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Коммунаров, 7, каб. 6 **по 30 января 2017 года** в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и с 14-00 до 16-00 от даты опубликования настоящего извещения.
К заявлению прилагаются следующие документы:
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);
- индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; гражданину Республики Беларусь – копия паспорта и копия договора на открытие текущего (расчетного) счета (в случае отсутствия у физического лица текущего счета – необходимо его открыть); представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность, заверенная нотариально.
При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.
Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Организатором аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.
Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор аренды в сроки, указанные выше; оплатить право аренды в сроки, определенные в договоре аренды, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3(трех) рабочих дней.
Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона.
Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору аренды

**Дополнительная информация по тел.: 8(029)341 15 45, 8(0232) 70 11 43**

# «НАС ПЯЦЁРА: ЧАТЫРЫ СЦЯНЫ І Я»

## Як жанчына знаходзіць сэнс жыцця, не выходзячы з дому

**Зінаіда Дубовік жыве адна ў двухпакаёвай кватэры ў аграгарадку Гацук. Апошнія 6 гадоў яна практычна не выходзіць на двор з-за праблем з пазваночнікам. Знаходзячыся ў чатырох сценах амаль без жывых зносін, можна было б азлобіцца на ўвесь свет. Але, як кажа Зінаіда Паўлаўна, часу няма. «Жыць засталося менш, чым пражыта. А справу ўсё больш і больш». Планы ж у жанчыны напалеонаўскія.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### «Няма з кім пагаварыць, дык я і разышлася»

На дварэ зіма, а на лесвічнай пляцоўцы побач з яе кватэрай ва ўсю «цвітуць» кветкі. Але не звычайныя, а папяровыя. Стаяць яны ў вазах, сплеценых з бісеру. А побач казачныя жывёлы, выразаныя з карчаг. Як высветлілася, уся гэтая прыгажосць — справа ўмелых рук Зінаіды Паўлаўны.

«Я, як белы парус у акіяне, шукаю ўсё штосьці. Як стары забыты фрэгат на прычале, усё чакаю кагосьці. Вось і дачакалася вас», — сустракае нас вершаванымі радкамі жанчына на мыліцах. І тут жа запрашае да стала. «Частуйцеся: вось сыр, яблыкі, хурма... А я тым часам пельмешкі разагрэю. Думала, вы раней прыедзеце, дык астылі». Жанчына спрытна завіхаецца ля пліты. Калі спрабуем дапамагчы, адмаўляецца. «Вы не глядзіце, што я на мыліцах. За столькі гадоў, як бачыце, прылаўчылася сябе абслугоўваць. Усё жыццё кіруюся прынцыпам: хочаш зрабіць добра, зрабі сам. Сацработнік толькі прадукты мне прыносіць».

На ўсе мае пытанні Зінаіда Паўлаўна адказвае не надта ахвотна.

«Колькі спіш і ў колькі прачынаешся — гэта такія дробязі. Часу засталося няшмат, таму не трачу ўпустую ні хвілінкі: днём — праца рук, уначы — розуму. Вось за апошнюю ноч амаль тры вершы нарадзіліся. Вы ешце, а я тым часам лепш пачытаю вам што-небудзь. Прозай трэба доўга тлумачыць, а вершам усё адразу зразумела».

Спачатку Зінаіда Паўлаўна чытае па памяці. Потым — з папяровых аркушаў, уздоўж і ўпоперак спісаных прыгожым, акуратным почыркам. Яе вершы — пра родную вёску з прыгожай назвай Белая Лужа, пра адзіную радасць у жыцці, пра справядлівасць і дабрыню, пра Бога — прасякнутыя болем і ўдзячнасцю... Жанчына чытае іх практычна без перапынку, быццам баючыся, што мы яе перарвём...

«Гэта няма з кім гаварыць, дык я ўжо разышлася», — спахапілася Зінаіда Паўлаўна і павяла нас у сваю карцінную галерэю.

### «Вышываю мужчын, бо жанчын не друкуюць»

У двух пакоях на канапе, ложку і падлозе ў некалькі шэрагаў расстаўлены карціны ў рамках. Спачатку мы падумалі, што яны намаляваныя фарбамі. Толькі калі прыгледзеліся, убачылі, што... ніткамі. На большасці карцін — прырода, кветкі. Таксама ёсць іконы. І некалькі партрэтаў вядомых людзей: Купалы, Коласа, Пушкіна, жонкі Рэрыха... Многія свае работы, у тым ліку і вышыты Уладзіміра Караткевіча ды Францыска Скарыны, вышывальшчыца падарыла Слуцкаму краязнаўчаму музею. «Аляксандра Лукашэнку таксама вышыла, — кажа Зінаіда Паўлаўна. — І напярэдадні яго юбілею перадала ў Адміністрацыю Прэзідэнта».

***— Чаму вырашылі вышыць партрэт Прэзідэнта?***

— Многія мне задаюць гэтае пытанне. Я вышываю славутых людзей. Аляксандр Лукашэнка — першы прэзідэнт за ўсю беларускую гісторыю. Яго ведаюць ва ўсім свеце. Вось я і падумала: чаму б мне яго не вышыць? У Прэзідэнта, відома, поўна партрэтаў. Але такога, як я вышыла, дакладна няма.

***— Гляджу, вы адных мужчын вышываеце...***

— Чые партрэты ў мяне былі ў вялікім памеры, таго і вышыла. Надрукавалі б у кнігах ці часопісах славутую жанчыну, я і яе «намалявала» б. Больш таго, у кніжных крамах поўна сусветных славутасцяў, а вось партрэты вядомых беларусаў паспрабуй знайдзі...

Мне кажуць: «А чаму вы не прадаяце свае работы?» Дык а хто купіць? Адна рамка каштуе 15 рублёў, а карціну хочуць набыць за 10. Людзі ж не разумеюць, колькі тут працы. Вось, напрыклад, сваю першую ікону я тры месяцы вышывала. У 10 гадзін раніцы пачынала і амаль да 10 вечара карпела над ёй. Я ж тады яшчэ сядзець магла. А як цяпер дык амаль год магу вышываць адну карціну, вочы стамляюцца хутка.

***— А цяпер над якой карцінай працуеце?***

— Нядаўна скончыла вось гэтую месяцавую дарожку. Цяпер адклала вышыўку, бо трэба пісаць кнігу. Я ж абяцала...

### «У санаторыі мяне называлі Архівам»

Каля ложка Зінаіды Паўлаўны тры тоўстыя штодзённікі. Жанчына запісвае туды свае ўспаміны. Робіць гэта лежачы, бо сядзець яна не можа. «Сваімі мемуарамі я сусветных праблем не вырашу. Гэта не «Вайна і мір». Хоць і была думка назваць кнігу «Мой мір і мая вайна». Каб яе выдаць, падлічыла, спатрэбіцца дзесьці 3000 рублёў. Пакрысе адкладаю з пенсіі.

Кожны чалавек штосьці павінен пасля сябе пакінуць. Кажуць, сляды на зямлі... А я лічу, што не сляды трэба пакідаць, а плады. Бацькі мае пра сябе асабліва не расказвалі... Дык, думаю, хоць я пакіну свае ўспаміны. Дзяцей у мяне няма, пляменнікам цяпер гэта не цікава. Але ж калі-небудзь яны дажывуць да маіх гадоў, захочацца штосьці даведацца пра свае карані — а спытаць няма ў каго. Яшчэ і з гэтай прычыны я вырашыла пісаць. Цяпер гэта для мяне самае галоўнае».

А прыгадаць Зінаідзе Дубовік ёсць што! Калі ёй было 8 гадзікаў, трапіла ў дзіцячы косна-туберкулёзны санаторый, што ў Еўпаторыі. Там правяла на ложку ў гіпсе 6 гадоў. «У 1953-м да нас прыехаў сімферопальскі пісьменнік. І неўзабаве пасля гэтага напісаў кнігу. «У імя жыцця» называлася. Мы, дзеці, моцна чакалі, калі выйдзе гэтая кніга. А калі прачыталі, яна нам не спадабалася».

**Любіла чытаць пра мараплаўцаў, вандроўнікаў, пра славутых людзей. Вучылася ў іх, як выходзіць з няпростых сітуацый, пераадольваць выпрабаванні. І такім чынам выпрацоўвала свой характар.**

***— Чаму?***

— Там было ўсё вельмі гладка. Пісалася пра тое, як працуюць дактары, як дзеці папраўляюцца. У якасці прыкладу прыводзілася гісторыя адной дзяўчынкі, якая два гадзікі пабыла ў санаторыі і здаровенькая на сваіх нагах з'ехала дадому. Гэта праўда. Але не галоўнае з нашага пункту гледжання. Бо такіх шчаслівчыкаў былі адзінкі... А вось чым мы там жылі па 8—10 гадоў, адны, без бацькоў — пра гэта не пісалася. Не было ні слова і пра Валерку... Хлопчык хварэў на туберкулёз пазваночніка, у яго былі паралізаваны ногі. Ад Валеркі адмовіліся бацькі. За 8 гадоў да яго ніхто не прыехаў, ніхто не напісаў яму ніводнага ліста. Калі дактары прызналі лячэнне бессэнсоўным, забіраць Валерку з санаторыя не было каму. Дык вось, памятаю, дзяўчаткі, што ляжалі са мной у палаце, доўга абураліся, чаму пра яго пісьменнік не напісаў. А потым вырашылі: «Зіна вырасце і напіша сапраўдную кнігу пра нас». Я паабяцала. І ўсё жыццё тое абяцанне не дае мне спакою.

***— Ці зможа ваша кніга дапамагчы дзецям, якія сёння, як і вы калісьці ў іх узросце, не могуць падняцца з ложка?***

— Спадзяюся. Мне ж дапамагалі кнігі. Дзякуючы ім я вандравала па свеце. Любіла чытаць пра мараплаўцаў, вандроўнікаў, пра славутых людзей. Вучылася ў іх, як выходзіць з няпростых сітуацый, пераадольваць выпрабаванні. І такім чынам выпрацоўвала свой характар. Дзякуючы кнігам я ведала ўсё на свеце. За гэта мяне ў санаторыі празвалі Архівам. Калі ўзнікала нейкае пытанне, усе дзеці, не раздумваючы, казалі: «Трэба ў Архіва спытаць».

Там жа, у санаторыі, я і навучылася вышываць гладдзю. Дзякуючы Клаўдзіі Уладзіміраўне. Настаўніца, якой было каля 70 гадоў, заўважыла, што я пастаянна штосьці малюю простым алоўкам на кавалках паперы, якія траплялі мне ў рукі. Таму і прынесла мне канву...

У Еўпаторыі Зінаіда Дубовік скончыла сем класаў. Потым бацькі забралі яе адтуль і дзяўчына пайшла ў звычайную школу. «Праляжаўшы 6 гадоў, мне цяжка было выседзець усе ўрокі за партай. Але я трывала. У санаторыі чытала запоем, таму па сваіх ведах я была на галаву вышэйшая за здаровых дзяцей. ...Пасля паспяхова скончыла медвучылішча. Працавала рэнтгенлабарантам, у медыцынскай статыстыцы. Пенсію зарабіла сабе сама. Тым не менш у школе (ды і далей па жыцці) адчувала сябе не такой, як усе, брыдкім качанём».

### «Я не люблю слова «лёс»

Зінаіда Паўлаўна падыходзіць да акна: «Раней мяне выручала прырода. Калі дрэнна, пойдзеш у лес ці на балота, паходзіш, падумаеш. Не трэба і таблеткі прымаць. З карчаг любіла рабіць розныя штукі: вось гэта *(паказвае фотаздымкі)* варона і лісіца, а тут — цюлень... Некаторыя мае вырабы з прыродных матэрыялаў вы ў пад'ездзе бачылі, штосьці — на падаконніку. Цяпер жа, каб быць бліжэй да прыроды, адкрыю акно і вышываю яе *(усміхаецца)*...

Відома, мне не хапае жывых зносін. З кім я магу кантактаваць у чатырох сценах? Сама нікуды не хаджу. І да мяне рэдка хто заходзіць. Па сутнасці я ўвесь час адна. Праўда, мне не трэба зносіны дзеля зносін... Колькі што каштуе ці хто з кім куды пайшоў — мне гэта не цікава. Гэта я не лічу зносінамі. А вось каб пагаварыць пра нешта глыбокае, як кажуць, душу адвесці, чамусьці павучыцца ў разумнага чалавека...»

...Перш чым сесці на маршрутку, мы вызваліся дапамагчы Зінаідзе Паўлаўне скласці яе карціны ў трыльяж, бо ўяўлялі сабе, як ёй цяжка было іх расставіць. «Дзяўчаткі, я сама складу. У мяне ў вызначаным парадку ляжаць. Вы ж не ведаеце...» — «Кажыце, у якім парадку, мы ўсё зробім, як мае быць». Ледзь угаварылі гаспадыню прыняць дапамогу. На развітанне падарылі ёй звяздоўскі фірмовы штодзённік, каб было куды ўспаміны ды вершы запісваць. Я, калі шчыра, упершыню бачыла, каб нехта так радаваўся звычайнаму нататніку.

— Зінаіда Паўлаўна, а можна мы разам са школьніцай завітаем да вас днямі, каб вы дапамаглі адабраць малюнкі на конкурс, — пытаецца Паліна Панамарова, маладзенькая дырэктар Гацукоўскага дома фальклору *(з якой наш фотакарэспандэнт сустрэла Новы год (гл. «Звязду» ад 3 студзеня))*.

— Відома, Паліначка, заходзьце, — засвяціліся радасцю вочы ў жанчыны.

Як жа мала патрэбна для таго, каб у адзінокага чалавека з'явілася на твары ўсмешка, — зславіла я сябе на думцы, — усяго толькі кропелька чалавечай цеплыні, увагі... І, як у выпадку з Зінаідай Паўлаўнай, прызнанне.

«...Нябачныя сілы мой век працягваюць. І я з падзякай Богу пра гэта пішу...» — працягвае чытаць свае вершы гаспадыня, пакуль мы апранаемся.

***— Зінаіда Паўлаўна, у вас сур'ёзныя праблемы са здароўем. І пры гэтым зусім няма крыўды на свой лёс?***

— Я ніколі не скардзілася на лёс, не хныкала. І наогул, я не люблю слова «лёс». Як быццам гэта табе навечна кляймо паставілі — ні ўлева, ні ўправа. Чалавек можа і з лёсам справіцца. Нас было 300 дзяцей у санаторыі, і ўсе з падобным лёсам. Але адзін жыве так. Іншы — па-іншаму. Лічу, што лепш за жыццё змагацца, чым з яго сысці. А адзінота — не самае страшнае. Галоўнае, каб чалавек не страціў сэнс жыцця. Ёсць такое жартаўлівае пажаданне: «Живите до ста лет, пока не рухнет ваш скелет». Дык вось, мой шкілет ужо рухнуў у прамым сэнсе, але я жыву *(усміхаецца)*. А вось гэты мой шкілет *(абводзіць позіркам свае карціны)* — не рассыплецца да апошніх дзён.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
nadzieja@zviazda.by

*Мінск — Слуцкі раён*

■ Хто каго?

# «Плёткі развялі суседзі, Што на жонцы Янка едзе...»

**Што было, — было. Не так важна, за куфлем піва ці кілішкам чаго мацнейшага разгаварыліся мужыкі пра самае-самае.**
**— Прызнайся, — папрасіў адзін, — у цябе з тваёй Люсяй да вяселля нешта было? Ну? Было?...**
**— Чаму ж не, — здзівіўся другі, — мы ж з ёй не маленькія. У мяне, помню, тэлевізар быў, у Люсі — шафа адзежы...**
**Што яшчэ? Ды тут, відаць, да бабкі не хадзі: каханне!**

Скажам адразу, што гэтую выснову зрабілі не мы, — чытачы «Звязды»: так-так, гэта яны ўважліва паглядзелі на верхні здымак і, як заўсёды, узяліся жартаваць, прыдумляць свае подпісы, каб потым — ужо на старонках газеты — паглядзець, што ж атрымалася, а ўрэшце — вызначыць, хто каго болей насмяшыў, хто каго перасягнуў у трапнасці.

Зрэшты, вынікі мы будзем падводзіць пазней, а пакуль — вершы. Пра хлопца, які ну, згадзіцеся са **спадарыняй Раісай Васільевай з Гомеля,**

*Нікому шанцаў не пакінуў,*
*Схапіў каханую дзяўчыну, —*
*Імчыць дамоў, каб хоць паспець*
*На пару Новы год сустрэць!*

Разумнае жаданне, бо яно ж праўду кажуць: як сустрэнеш Новы год, так і пражывеш. Хлопцу хочацца пражыць з каханай.

Неяк дзіўна, кажаце, ён «імчыць»?

А вось гэта ўжо — як можа. На думку **спадарыні Соф'і Кусянковай з вёскі Лучын, што на Рагачоўшчыне:**

*Ясь не мае «Мазэраці»*
*(Як, дарэчы, й «Лады»), —*
*Дзевак возіць на цыраце,*
*А яны і рады.*

Пра тое ж прыкладна і радкі **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска:**

*Як не маеш «Вольва»*
*Ці хаця б «Нісан»,*
*Каб падвезці Вольгу,*
*Запрагайся сам.*

Думаеце, мала такіх — дурных ці хоць бы ахвотных?.. І памыляецеся, бо вось гэты, са здымка (паводле той жа **спадарыні Чыгрынавай**), сваю Вольгу не моўчкі вязе, а, можна сказаць, з песняю:

*Я ў Мані на аркане,*
*А яна — у цэлафане.*
*Праз любоўны той дурман*
*Стане мілым і аркан.*

Вы чамусьці не верыце? Тады — маленькая праўдзівая гісторыя ад **спадарыні Алены Кулік з Валожыншчыны:**

*Пасля працы сіл — ні грама:*
*Не дайду сягоння з крамы.*
*І ў каханага мужчыны —*
*Каб кабылка, каб машына...*
*Але ж я сказала:*
*— Мілы,*
*Ты замчы мяне на... крылах!*
*Не спужаў яго мароз:*
*Ён запрогся і павёз!*

Ёсць, ёсць мужыкі ў нашых сёлах! Хоць...

Не без таго: мае, відаць, рацыю і **спадарыня Чыгрынава,** якая лічыць, што

*Гэта, людцы, выезд... пробны:*
*Кось-кось-кось — тады ў аглоблі.*

Няясна, праўда, хто каго — завязе ды потым запражэ. Адна маладзіца, прынамсі, скардзілася мужу: «Я ў цябе, дальбог, за Папялушку: то гатую, то мыю, то шыю, то прыбіраю...».

Ведаеце, што пачула ў адказ? «А я папяраджваў, што замуж выйдзеш і нібы ў казку патрапіш».

Падобна, што якраз яна, гэта «казка», і прадыктавала радкі **мужу і жонцы Астроўскім з Мінска:**

*Плёткі развялі суседзі,*
*Што на жонцы Янка едзе...*
*Паказаў ім Ясь тады,*
*Хто тут едзе сапраўды.*

Каб упэўніцца, што не Янка, можаце яшчэ раз глянуць на здымак і тады, магчыма, разам са **спадарыняй Галінай Пятроўскай з вёскі Ардашы Смаргонскага раёна** задумаецеся: «А куды (канкрэтна) вось з гэткім імпэтам можна цягнуць маладзіцу? Чым (зноў жа канкрэтна) гэтая паездка можа скончыцца?» Для яе, у прыватнасці? І ці не трэба тут нагадаць крылатае:

*Вецер вее ў завею —*
*Вішанька калышацца...*
*Ой, не вер, дзяўчына, хлопцу,*
*Покуль не распішацца!*

Бо — можа ж стацца — паабяцае цэлы свет падарыць, а падорыць хіба што глобус, паабяцае машыну, а пасадзіць на цырату, альбо замуж узяць, жыццё пражыць, а сам...

Што галоўнае тады? Паводле **спадарыні Пятроўскай,** не губляць аптымізму, шукаць выйсце і нагадваць пра сябе (калі, крый Бог, даведзецца) нейк адмыслова, прыгожа, прыкладна так:

*— Ой, муж, калі дуж,*
*Памагай маёй бядзе:*
*З'ела пеўніка жывога,*
*Варухнуўся ў жываце.*

І кім жа трэба быць, каб тады не адгукнуцца: не паслухаць — як варушыцца, як дыхае, як ножкамі стукае, як песенькі пяе...

Не пеўнік, канешне...

А зрэшты і сапраўды:

*Эх, каханне ты каханне...*
*Лёгкі смех з яго бяро:*
*Каго любіш, той не гляне,*
*Каго не — дамоў вязе.*

Ёсць пытанні: і чаму тады вязе?.. І чаму на мяшку? Паводле **спадара Міколы Кісяля з Мінска,** апошняе зразумела:

*Нельга траціцца на санкі:*
*Эканоміць грошы Янка.*
*— Маня, — кажа ён, — не паня:*
*Добра ёй і ў цэлафане.*

Нейкі час (пакуль Янак назбірае грошай на машыну) — магчыма...

А зрэшты, тут яшчэ адно выйсце ёсць. Расказвалі, унучак малы прыбег з коўзанкі і бразь канькі пасярод пакоя. «Дзіцятка, яны ж замінаць тут будуць», — робіць заўвагу дзед. — «А ты іх адкінь». Ну што ты будзеш рабіць: паслухаў стары малога — адкінуў... Некуды пад шафу. Унук тут жа ў крык: «Ур-ра! У нас машына будзе!» — «З чаго ты ўзяў?» — пытаецца дзед. — «Дык учора ж тата мамцы казаў, што купіць яе, калі дзед канькі адкіне».

Свят-свят-свят, няхай жывуць і стары, і малы, няхай усе радуюцца жыццю, спяваюць... Альбо хоць успамінаюць старыя песні (як **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**) і ствараюць з іх новыя. Такім чынам, папуры — дыялог паміж ІМ і ЁЮ:

*— Завязу цябе я ў тундру,*
*Завязу на край зямлі...*
*— Можа, лепей на Гаваі,*
*У круіз на караблі?*
*— З неба зорачку дастану,*
*Для цябе я ўсё змагу...*
*— І ў карэце» з цэлафану*
*Мы паедзем па даху?!.*

Гэта (падкажам) футра такое — цёплае-цёплае. (Анекдот у тэму: жонка з раніцы села на скрыпцы іграць. Мужык трохі паслухаў, а потым кажа: «Ну, можа, досыць? Куплю табе новую сукенку».)

На футра, вядома ж, трэба даўжэй іграць. (Яшчэ адзін анекдот. «Нам на працы будуць даплачваць, 15 працэнтаў, за шкоднасць», — хваліцца жонка. «Там ты таксама ўжо ўсіх дастала?» — пытаецца муж.)

І нават больш за тое: ён (на думку **спадара Віктара Сабалеўскага з Уздзы)** пачынае дзейнічаць:



*Галя ложак не заслала:*
*Прытамілася, заспала.*
*Галя посуд не памыла —*
*Да паўдня глядзела «мыла»...*
*Муж такую гаспадыню*
*Без увагі не пакіне:*
*Разам з трантамі ў канаву*
*Скіне лежня — і ўся справа!*

А што: хай ведае, як «даставаць»...

Другі з варыянтаў ад **спадара Віктара** больш аптымістычны:

*Вася з Маняй любяць госці.*
*Як ідуць — Васіль пяе,*
*Не замежнае там штосьці —*
*А «... як ехаў да яе».*
*Пасля трэцяй аглаблёвай*
*Зусім іншы «эксклюзіў»:*
*Ужо Маня цягне словы:*
*«Ты вязі, мяне, вязі...»*

І — што ты будзеш рабіць?! — вязе бядак, трэба разумець, не зусім цвярозую жонку. І добра, калі гэта зрэдку, а калі...

«Мужчынскі алкагалізм сустракаецца куды часцей, чым жаночы, але апошні нашмат страшнейшы», — нагадвае **спадар Мікалай Старых з Гомеля** і дадае, што на здымку ўбачыў адзін са спосабаў барацьбы з ім:

*Напівацца стала жонка...*
*Муж схапіў яе спрасонку,*
*На старызну пасадзіў*
*І на звалку паруліў....*
*Страх адолеў маладзіцу.*
*Пачала яна прасіцца:*
*— Чалавекам заўтра буду:*
*Назаўжды віно забуду!*

Во каб чытае ды пабачыць! Муж, відаць, дорага заплаціў бы?!

Што да парад, то яны, як вядома, бясплатныя. У тым ліку і вось гэтая, ад **спадарыні Ніны Бурко з вёскі Капланцы Бярэзінскага раёна:**

*Знае хлопец, што рабіць,*
*Калі дзеўка сядзе піць:*
*Пакатае ў цэлафане,*
*Яна ўміг цвярозай стане.*

А зрэшты, трэба прыглядзецца: можа, на здымку і не дзеўка зусім, і не маладзіца? Можа, гэта...

Слова **сужэнцам Астроўскім:**

*Гаварыць тут можна смела:*
*Цешча зяцю плеш праела*
*Зносіць звягі — не выходзіць...*
*Ён тапіць яе адвозіць.*

Куды можна яшчэ? Вось меркаванне **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў:**

*Зіма... Раскоўзаны дарожкі...*
*Ганулька падвярнула ножку.*
*Васіль — спагадлівы мужчына —*
*Вязе ў ФАП такім вось чынам.*

Малайчына, праўда? Здымаем капялюш, як той казаў! Прычым не толькі за тое, што пашкадаваў тую Ганульку (ці больш яе ножку?): ён, на думку **сужэнцаў Астроўскіх,** традыцыі продкаў шануе:

*У нашых вёсках, сэрцу мілых,*
*Так радзіны адзначалі:*
*Мужыкі (зусім не з хілых)*
*Бабку ў санчаках каталі.*
*Тут — мужык адзін застаўся*
*І ні санак, ні калёс...*
*Дык яму мяшок прыдаўся:*
*Бабцю ўкінуў ды павёз!*

І, як бачыце, едзе: з боку «бабці» ніякіх прэтэнзій няма і нават быць не можа — на думку **спадара Анатоля Гарачова з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна,** бо

*Здаралася такое не штодня,*
*Даўно...*
*А людзі не забылі:*
*У санях, дзе мядзведзь замест каня,*
*Магнаты пакуражыцца любілі...*
*І ў нашы дні, калі прыйшла зіма,*
*Ты, далібог, сябе адчуеш панам!*
*Няма мядзведзя? І каня няма?*
*Дык дзеўка ж ёсць! І плёнка з цэлафану...*

Вось на гэтай жыццесцвярджальнай ноце і завяршыць бы чарговы агляд, ды папрасіліся ў яго — не зусім да здымка — але ж прыгожыя і патрэбныя радкі **спадарыні Любові Чыгрынавай:**

*Цягнем, цягнем у дом*
*Без патрэбы і патом*
*Цэлафан, паралон,*
*Пэтбутэлькі, пакеты...*
*А пасля ўсё — у смецце...*
*І нясі, буйны вецер,*
*Па лугах і палях,*
*Па шляхах ды ўзлессях...*

Калі надыдзе вясна (а гэта абавязкова здарыцца!) і растане бялюткае снежнае пакрыва, гэтыя залежы бруду мы, вядома ж, убачым, але ж, да яго стварэння самі не прычынімся?

Зрэшты, гэта іншая тэма і адпаведна — іншая размова. У гэтай жа — час падвесці вынікі.

Такім чынам на папярэднім здымку (гл. «Звязда» ад 7 снежня 2016 года) быў статак гусей, якіх на беразе вадаёма спыніў грозны надпіс: «Купацца забаронена». Паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі да гэтага сюжэта прыдумалі **спадары Мікалай Старых з Гомеля, Васіль Міронччык з Бабруйска, Валерый Гаўрыш з Чавусаў, Мікола Кісель і муж і жонка Астроўскія з Мінска,** а таксама **спадарыні Соф`я Кусянкова з Рагачоўшчыны, Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, Ніна Бурко з Бярэзіншчыны, Любоў Чыгрынава з Мінска і Раіса Васільева з Гомеля,** з чым, у прыватнасці, пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету «Звязда» (на другі квартал гэтага года) накіроўваецца ў Гомель.

Хочаце, каб газета прыходзіла і да вас? Тады выпісвайце: нагадаем, што да 27 студзеня можна падпісацца на люты (сакавік альбо нават да канца паўгоддзя). Другі варыянт: уважліва глядзіце на новы здымак, прыдумвайце подпіс — карoткі (не больш за восем радкоў), дасціпны, на беларускай мове і дасылайце ў рэдакцыю. Шанцы на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР.**
dounar@zviazda.by

**Ад яе ж шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі гэтым разам не прайшлі строгі конкурсны адбор** ■



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Толькі ў «Звяздзе»

# МАЛАВЯДОМЫ ЭТНОГРАФ З БЕЛАРУСІ

## На жаль, прозвішча Аляксандра ЭСТРЫНА родам з Мсціслава, якога параўноўваюць з Міклуха-Маклаем, малавядомае

**Ён унёс вялікі ўклад у этнаграфію, антрапалогію, а таксама ў заалогію. Прадметы з калекцый, якія ён збіраў, можна ўбачыць у Санкт-Пецярбургскай кунсткамеры. Ён сябраваў са знакамітым скульптарам Агюстам Радэнам, быў знаёмы з бальшавіцкім дзеячам Анатолем Луначарскім і іншымі вядомымі людзьмі. Максім Горкі дапамог яму з жонкай вярнуцца на Радзіму. Ён пабываў у ЗША, Кітаі, Японіі, на востраве Ява...**



Аляксандр ЭСТРЫН у 1970-я гады.

### ЭСКІЗЫ РАДЭНА Ў... БУРЖУЙКУ

Аляксандр Самуілавіч нарадзіўся ў правінцыйным Мсціславе ў 1889 годзе ў шматдзетнай сям'і. Яго бацька, як і дзед, і прадзед, быў рабочым. Верагодна, таму ў Сашы былі «залатыя рукі». Ён лёгка навучыўся апрацоўваць метал у родным гарадку. І працягнуў «шліфаваць майстэрства» ў Санкт-Пецярбургу. Каб хлопец патрапіў у Парыж і стаў сапраўдным «асам металічных спраў», бацькі прадалі карову. У сталіцы Францыі жыў іх далёкі сваяк. Дарэчы, Саша не ведаў ні слова па-французску, ды і рускай валодаў дрэнна. Размаўляў на ідыш. Але хутка за мяжой засвоіў дзве мовы. Сярод парыжан было нямала рускіх...

Ён вучыўся майстэрству ахвотна. І атрымаў вышэйшую кваліфікацыю па халоднай апрацоўцы металу, стаў высокакваліфікаваным зваршчыкам.

У Луўры Аляксандр слухаў лекцыі Луначарскага пра мастацтва. Агюст Радэн не шкадаваў кампліментаў на адрас «майстра на ўсе рукі». І ў знак вялікай сімпатыі падарыў яму свае эскізы. Праз гады імі прыйдзецца замест дроў падтрымліваць агонь у буржуйцы ў блакадным Ленінградзе. Такім чынам цеплыня мастацкай прыхільнасці стала «цяплом для жыцця». І сям'я Эстрына выратавалася ад холаду...

Але да Другой сусветнай вайны яшчэ было шмат часу. А падчас Першай сусветнай наш герой паехаў у ЗША. Працаваў у Нью-Ёрку ў механічных майстэрнях. Вывучыў англійскую мову. Мог бы і застацца ў краіне, дзе ва ўсе часы цанілі майстроў з вялікай літары. Але цягнула дамоў.



З інданезійскай калекцыі.

### ВАЛОДАЎ ДЖЫУ-ДЖЫЦУ!

Параход, які накіроўваўся ва Уладзівасток, з нейкіх прычын прышвартаваўся ў порце кітайскага горада Шанхая. Без праблем Аляксандр знайшоў работу і там. Потым пераехаў у Японію, дзе пазнаёміўся з дзяўчынай Ганнай Якаўлеўнай Сматрыцкай, якая стала яго жонкай.

Яе малая радзіма — украінскі Елісаветград (да 2016 года — Кіравагард, цяпер — Крапіўніцкі). Цікава, што яна — дачка багатых яўрэйскіх бацькоў вучылася іграць на фартэпіяна ў знакамітага потым піяніста і педагога Генрыха Нейгаўза (народны артыст РСФСР). Пасля рэвалюцыі ў сталіцы Расіі працавала ў дзіцячай працоўнай калоніі. Лёс закінуў яе праз Уладзівасток у Кітай. Там яна жыла пры сям'і рускай артысткі. Потым апынулася ў Японіі.

На востраве Ява Аляксандру прапанавалі працаваць у доку, які будаваўся. Выклікаў да сябе жонку. Праз знаёмых яна даведалася, што галандскія заолагі плануюць адправіцца на Малукскія астравы (усходняя частка Малайскага архіпелага). Сярод іншага і на востраў Буру. Там раней не было расійскіх этнографаў.

Муж і жонка вывучалі прадстаўнікоў мясцовай флоры і фаўны. Аляксандр аднойчы ледзь не памёр ад укусу павука. Яго маглі забіць і туземцы. І не раз яму дапамаглі выжыць прыёмы барацьбы джыу-джыцу. Ім яго навучылі японскія сябра. Гэты від барацьбы згадваецца і ў кнізе пра Шэрлака Холмса...

Ужо як паліглот, Эстрын вывучыў тутэйшую мову. Члены экспедыцыі вельмі цанілі яго і за тое, што ён мог адрамантаваць любы механізм. Муж і жонка стойка выносілі ўсе цяжкасці жыцця ў паходных умовах.

Падчас навуковага падарожжа яны захапіліся этнаграфіяй. Уявіце: у галандскіх калоніях сабралі калекцыю, экспанаты якой важылі каля 1,5 тоны! І большасць з іх не купілі, а абмянялі і атрымалі ў падарунак.

### ГОРКІ ДАПАМОГ

З дапамогай галандцаў Эстрын з жонкай вярнуўся ў Еўропу. У Амстэрдаме ім прапанавалі выкупіць калекцыю. Але яны катэгарычна адмаўляліся. І горда адказвалі, што збіралі яе для сваёй Радзімы.

Яны каля года чакалі дазволу вярнуцца ў Расію. Нехта параіў ім звярнуцца па дапамогу да Максіма Горкага, які жыў у Германіі. І знакаміты літаратар зрабіў усё магчымае. У прыватнасці, адправіў ліст у Акадэмію навук. Ён захаваўся ў архіве. Горкі прасіў свайго таварыша паспрыяць у перадачы 25 скрынак з экспанатамі ў музей...

А калегу па пісьменніцкім цэху Канстанціну Федзіну Горкі пісаў: «Ён — рабочы, металіст, яна — настаўніца. Беглі ад Калчака і чатыры гады падарожнічалі, жывучы — яна — ўрокамі моў, ён — варкай металаў, а адначасна сабралі дзівосна поўную — па словах Акадэміі — калекцыю... Вось — людзі нашых дзён!



Ганна СМАТРЫЦКАЯ і Аляксандр ЭСТРЫН на востраве Ява з мясцовай жыхаркай (фота зроблена ў пачатку 1920-х гадоў).

Яны жывуць у гарах Атласа, у старажытнай Нумідыі, у Бразіліі і Патагоніі, могуць жыць на Месяцы»...

Хутка вымушаныя эмігранты атрымалі візы, бясплатныя білеты на параход. Іх вызвалілі ад выплаты мытных пошлін, бо калекцыю везлі ў падарунак савецкай дзяржаве.

Экспанаты былі высока ацэнены і перададзены ў Кунсткамеру і заалагічны музей. Эстрын працаваў у музеі. Сям'я атрымала невялікую кватэру ў Ленінградзе. Нарадзіўся сын, якога таксама назвалі Саша.

Аляксандр Самуілавіч ахвотна адправіўся ў экспедыцыю на Далёкі Усход. Там вывучаў жыццё нанайцаў. Вядомыя этнографы адзначалі, што ў яго прыродны чуццё і дар вывучаць традыцыі і быт малых народаў.

### ПАМЁР У ЖАБРАЦТВЕ...

Цудам Эстрын не быў адпраўлены ў лагер падчас сталінскіх рэпрэсій. Праўда, аднойчы па яго прыехалі «строгія мужчыны» і звезлі. Больш за месяц яго не было дома. Вярнуўся без пярэдніх зубоў... Зразумела, маглі і расстраляць чалавека, які доўгі час жыў за мяжой, ведаў некалькі моў, сябраваў з іншаземцамі.

Сям'я таксама воляй нябёсаў перажыла першую блакадную зіму. Вывезлі яе па знакамітым Ладажскім возеры. Жылі ў Арменіі, Казахстане. Разумны чалавек, які мог бы шмат карысці прынесці навуцы, працаваў рабочым на заводзе. Зваршчыкі, канешне, былі патрэбны болей.

Пасля вайны сям'я жыла ў Маскве. Бедна і ўжо без надзеі зноў заняцца этнаграфіяй. Ды і калекцыю чамусьці «схавалі» ў запасніку. Эстрын працаваў зваршчыкам. Жонка — выхавацелем у садку. Спачатку памерла яна. А праз 15 гадоў сляпы і цяжка хворы Аляксандр Самуілавіч — у сацыяльнай установе для састарэлых. Іх сын мог бы зрабіць ндрэнную кар'еру ў разведцы, але гэтаму перашкаджалі звесткі пра бацькоў, якія жылі за мяжой.

Безумоўна, жыццё Аляксандра Эстрына і яго жонкі заслугоўвае большага вывучэння. На жаль, у газеце немагчыма расказаць пра ўсе перыпетыі іх цікавага і нялёгкага жыцця. Упэўнены, што іх лёс можа зацікавіць кінематаграфістаў. Дарэчы, за мяжой Эстрын больш вядомы, чым у нас.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*pukshanski@zviazda.by*

***P.S.** Аўтар дзякуе за дапамогу ў падрыхтоўцы артыкула Аляксандру Баршаю з Ізраіля, даследчыку жыцця і дзейнасці А. Эстрына*

■ Настраёвае

# КОЦІКІ СМАЖАНЫЯ І ДУХМЯНЫЯ

## Вярнуцца ў дзяцінства дапамогуць «цацкі з гарышча», зробленыя сваімі рукамі, якія маюць водар кавы



**Гавораць, лепшы падарунак для дарослага мужчыны — верталёт, якім можна кіраваць. Ён не захоча ў гэтым прызнацца, але гуляць будзе з задавальненнем. Многія жанчыны таксама не скажуць адкрыта, што не дагулялі ў лялькі. Таму часам не стрымліваюцца і спантанна купляюць мяккую цацку або ляльку з вялікімі вачыма — быццам для дачкі, насамрэч — для сябе. Але ж зараз — не пра псіхалагічныя аспекты такіх дзеянняў. Зараз пра цацкі, якія можна зрабіць сваімі рукамі. Такія, напрыклад, як робіць Юлія АСАДЧАЯ з Лоева.**

У яе дзве адукацыі. Па першай дзяўчына — зубны тэхнік, але ж своечасова зразумела, што займацца трэба тым, што любіш, а не тым, на што бацькі скіроўвалі. Таму Юлія яшчэ закончыла мастацка-графічны факультэт Віцебскага ўніверсітэта імя Машэрава. Жывапіс прыносіць ёй радасць, але ж на яго патрэбны час. Цяпер, займаючы пасаду загадчыка сектара па рабоце з сельскімі ўстановамі культуры ў Лоеўскім гарадскім цэнтры культуры, Юлія знаходзіць магчымасць для творчасці яшчэ і ў вырабе цацак з водарам кавы. Дарэчы, ідэя была запазычана з інтэрнэта.

— Скінула сабе некалькі здымкаў такіх цацак і паказала дзяўчатам на рабоце. Прапанавала: можна заняцца разам. А потым гэта стала калектыўнай творчасцю. Усім падабалася. Звычайна я малюю выкрайкі, а дзяўчаты шыюць па іх цацкі. Іх набіваюць сінтэпонам, пакрываюць сумессю кавы, карыцы і клею ПВА і... смажаць у духоўцы. Каб замацаваць форму. На цацку потым наносіцца малюнак. А водар які падчас запякання! Вы ж можаце панюхаць і саму цацку — яна доўга захоўвае водар кавы.

Гэта спачатку былі запазычаныя ідэі. Потым Юлія пачала прыдумваць нешта сваё, і яе цацкі паступова набылі ўласны твар. Хоць кажуць, што любы мастак, што б ні рабіў, усё роўна робіць нешта, падобнае да сябе. Між тым невялічкі калектыў калег і аднадумцаў дапамагае ўвасабляць ідэі ў масавае жыццё. Дарэчы, потым агульная творчасць з'яўляецца на выставах, якія ладзяцца і на Лоеўшчыне, і па-за яе межамі.

Канешне, і «замурчастыя» коцікі сталі натхняльнікамі самых розных вобразаў — ці то жывёл, ці то людзей. Яны ж апрануты ў адзенне, п'юць ктэйлі, дораць кветкі і самі падобныя да анёлаў-амураў-мурмураў. Яны нешта жадаюць адзін аднаму і абавязкова ўсміхаюцца, шчыра — як сама Юля.

Мядзведзікі, зоркі, малпачкі, совы, сабачкі і нават дамкі таксама ўсміхаюцца. Ці здзіўляюцца, ці радуюцца магчымасці парадаваць іншых. Юля ж растлумачвае, што такую цацку пры жаданні можна паспрабаваць зрабіць самому. Ніякіх сакрэтаў тут няма — і парад у тым жа сусветным павуціння — зашмат.

Самыя любімыя з тых, што прыдумала, — на гэты момант утульныя двухбаковыя дамкі. Гаворыць, што шасцігадовы сын Раман ужо падключыўся да агульнай справы і нават разам з матуляй намаляваў сваю першую цацку:

— Бывае настрой жартоўны, бывае — лірычны. Таму і цацкі розныя атрымліваюцца. Многія людзі замаўляюць да пэўных свят: агульных, як да 8 Сакавіка або Дня закаханых, ці прафесійных. Мы рабілі жартоўных жывёлак да Дня міліцыі і да Дня пагранічніка. Кожнаму падабаецца нешта сваё, угадаць нельга — што каму больш. У асноўным людзі набываюць дробныя цацкі, якія можна недзе прымацаваць, каб яны былі бачныя.

Цацкі Юліі Асадчай — з характарам. Таму іх часам замаўляюць персанальна. Набыўшы адну цацку,



некаторыя звяртаюцца да Юліі потым яшчэ не раз — давяраюць густу мастака.

— Галоўнае — не толькі ўвасобіць тое, што недзе падгледзеў, але і сваю фантазію падключыць. Пакуль ніхто не скардзіўся на мае прыдумкі.

Між тым такія самаробныя цацкі дадаюць у любы інтэр'ер нешта дамашняе і ўтульнае. Тое, што робіць Юлія з сяброўкамі, умоўна можна аднесці да так званых тыльдаў. Тыльда сёння — гэта гандлёвы брэнд, у канцы мінулага стагоддзя запатэнтаваны нарвежкай Тоні Фінагер. Але ж цяпер так называюць не толькі адмысловых лялек ручной работы без твару, пашытых з тканіны. Яны сёння маюць розныя формы: звяркі, зорачкі, садавіна, гародніна і шмат што іншае. Гэты стыль можна назваць наіўным, простым ці вясковым, але ў той жа час лялька ў першую чаргу мае настрой. Галоўны сэнс такіх цацак — вярнуць нас у дзяцінства. Што часам вельмі патрэбна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

*iost@zviazda.by*

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» 24 февраля 2017 г. проводит 203-й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений** *тел.: +375 (17) 225 22 25, +375 (17) 225 66 22* | | | | | | | |
| 88 | Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Вокзальная, 11 | 10,2 | 3,0 | 34,68 | Под организацию розничной торговли непродовольственной группой товаров (кроме товаров, бывших в употреблении и товаров ритуального назначения) | 3,40 | Помещение в здании вокзала станции «Беларусь». Год постройки – 2002. (10*) |
| | *10* Материал стен – панель. Крыша – металлочерепица. Полы – плитка. Отопление – радиаторы металлические. Водопровод – стальные трубы. Канализация – чугунные трубы. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – венткамеры. Телефон – каблировн.* | | | | | | |
| 89 | г. Минск, ул. Ульяновская, 41, лит. А 5/К | 14,1 | 3,0 | 47,94 | Под размещение сотрудников | 4,70 | Помещение в жилом доме. Год постройки – 1953. (11*) |
| | *11* Стены наружные и внутренние – кирпичные. Перегородки – гипсовые. Перекрытия – железобетонные. Крыша – нет. Полы – плитка. Проемы оконные – нет. Проемы дверные – ПВХ. Внутренняя отделка – оштукатурено, окрашено. Отдельный вход. Отопление – центральное, водопровод – нет. Канализация – нет. Электроснабжение – скрытая проводка. Горячее водоснабжение – нет. Вентиляция – естественная* | | | | | | |
| 90 | г. Минск, ул. Чкалова, 16 | 26,8 | 3,0 | 91,12 | Под организацию розничной торговли продовольственной и непродовольственной группой товаров (кроме товаров, бывших в употреблении и товаров ритуального назначения) | 9,10 | Помещение в здании многоквартирного жилого дома. Год постройки – 1940. (12*) |
| | *12* Стены наружные и внутренние – кирпичные. Перегородки – кирпичные. Перекрытия – железобетонные. Крыша – нет. Полы – плиточные, бетонные. Проемы оконные – нет. Проемы дверные – ПВХ. Внутренняя отделка – облицовано, обшито. Отопление – центральное. Водопровод, канализация – есть. Электроснабжение – скрытая проводка. Горячее водоснабжение – нет. Вентиляция – есть* | | | | | | |
| 91 | г. Минск, ул. Московская, 7 | 192,0 | 2,0 | 652,80 | Под организацию розничной торговли непродовольственной группой товаров (кроме товаров, бывших в употреблении и товаров ритуального назначения) | 65,20 | Помещение в многоквартирном жилом доме. Год постройки – 1958. Материал стен – кирпич. Крыша – мягкая рулонная. Полы – плиточные. Отопление – центральное. Водопровод – трубы металлические от уличной сети. Канализация – чугунные трубы, центральная. Электроснабжение – скрытая проводка |
| 92 | г. Минск, ул. Бобруйская, 23-30 | 101,6 | 2,0 | 345,44 | Под размещение объекта общественного питания | 34,50 | Помещение находится в подвале здания. Год постройки – 1953. (13*) |
| | *13* Материал стен – кирпич. Объем изолированного нежилого помещения 430 куб.м. Перегородки – кирпичные, гипсокартонные. Полы – плитка, ламинат. Отопление – центральное, водопровод от уличной сети. Канализация – центральная. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная. Не используется с 21.01.2015* | | | | | | |

БАВ – базовая арендная величина с 01.07.2016 составляет 13,60 рублей.
**Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.**
**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**
Аукцион состоится **24 февраля 2017 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**.
**Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.**
Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049, а также иными актами законодательства.
Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.
**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**
- уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 203 от 24.02.2017 по предмету аукциона №______**), перечисляемый на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**
- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):
***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***
копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;
копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***
легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
***индивидуальный предприниматель:***
копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
***физическое лицо*** – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
- заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.
При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:
физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;
представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.
**Прием документов** и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 26 января 2017 г. по 20 февраля 2017 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**
Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.
**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**
**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.
*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*
**Порядок определения победителя аукциона:**
- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;
- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).
**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения аукциона.**
Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.
***Важно!*** *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды помещения, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*
Договора аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.
**Телефоны для справок: отдел аукционов** + 375 (17) 327 40 22,
**отдел аренды** + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57,
**бухгалтерия** + 375 (17) 328 36 58.
**Интернет: www.mgcn.by**

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
19.01.2017
Лихачевский В. В.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ДЕВЯТОГО ВЫПУСКА
## Общества с ограниченной ответственностью
# «ДЕКО-ПЛАСТ»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:
на белорусском языке: полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ДЭКА-ПЛАСТ»; сокращенное – ТАА «ДЭКА-ПЛАСТ»;
на русском языке: полное – Общество с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (далее – эмитент); сокращенное – ООО «ДЕКО-ПЛАСТ».

2. Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, д. 17, 5-й этаж, офис 3; телефон/факс: 8 (017) 3464137; электронный адрес (e-mail): info@tapas.by, сайт: www.tapas.by (далее – сайт эмитента).

3. Эмитент зарегистрирован Минским областным исполнительным комитетом (далее – Миноблисполком) от 23 июля 2002 г. № 503. Регистрационный номер – 600422579.

4. Уставный фонд эмитента составляет 556 000 белорусских рублей.

5. Основные виды деятельности эмитента: реализация проектов, связанных со строительством зданий.

6. Депозитарием эмитента является депозитарий открытого акционерного общества «БПС-Сбербанк» (зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г., регистрационный №25; действует на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1086, выданного 8 декабря 1993 г., срок действия не ограничен; место нахождения: 220005, Республика Беларусь, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6).

7. Эмитент в случаях и порядке, установленных законодательством Республики Беларусь, раскрывает информацию на рынке ценных бумаг путем ее размещения на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее – Единый информационный ресурс), а также путем ее опубликования в газете «Звязда», и (или) размещения на сайте эмитента, либо путем ее доведения до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным законодательством Республики Беларусь, а также путем ее представления в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, определенному кругу лиц.

